СА «ЗВЯЗДОЙ» — У НОВЫМ ГОДЗЕ!

Заканчваецца падпіска на I паўгоддзе і I квартал 2009 года

Падпісныя цэны на газету «Звязда» (у рублях)

Індэкс	на 1 месяц	на 3 месяцы	на 6 месяцаў
63850 (індывідуальны)	**10120**	**30360**	**60720**
63145 (індывідуальны льготны для пенсіянераў, ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны)	**9570**	**28710**	**57420**
63858 (ведамасны)	**16170**	**48510**	**97020**
63239 (ведамасны льготны для ўстаноў міністэрстваў культуры, адукацыі і аховы здароўя)	**14740**	**44220**	**88440**

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

Б Е Л А Р У С К А Я Г А З Е Т А

30 СНЕЖНЯ 2008 г.
АЎТОРАК
№ 244
(26357)

Кошт 500 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 Г.

Указ Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь № 710

Аб аб'яўленні 2009 года Годам роднай зямлі

У мэтах захавання і прымнажэння нацыянальнага духоўнага і культурнага здабытку, гістарычнай спадчыны і прыродных багаццяў краіны, самабытных традыцый беларускага народа, выхавання моладзі ў духу любові да Айчыны, а таксама арганізацыі мерапрыемстваў у сувязі са святкаваннем 65-й гадавіны вызвалення Рэспублікі Беларусь ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў **пастанаўляю:**

1. Аб'явіць у Рэспубліцы Беларусь 2009 год Годам роднай зямлі.

2. Савету Міністраў Рэспублікі Беларусь зацвердзіць рэспубліканскі план мерапрыемстваў па правядзенні ў 2009 годзе Года роднай зямлі, забяспечыць каардынацыю дзейнасці дзяржаўных органаў, іншых арганізацый па яго выкананні і прыняць іншыя меры па рэалізацыі гэтага Указа.

3. Рэспубліканскім органам дзяржаўнага кіравання, аблвыканкамам і Мінскаму гарвыканкаму зацвердзіць галіновыя і рэгіянальныя планы мерапрыемстваў па правядзенні ў 2009 годзе Года роднай зямлі.

4. Гэты Указ уступае ў сілу з дня яго афіцыйнага апублікавання.

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь
А. ЛУКАШЭНКА.

29 снежня 2008 г., г. Мінск.

Аляксандр ЛУКАШЭНКА: «Якасць законапраектаў, якія распрацоўваюцца, павінна быць высокай»

Кіраўнік беларускай дзяржавы Аляксандр Лукашэнка 29 снежня сустрэўся са старшынямі абедзвюх палат парламента Беларусі Барысам Батурам і Уладзімірам Андрэйчанкам.

Прэзідэнт цікавіўся бягучай дзейнасцю беларускіх парламентарыяў. У сувязі з тым, што цяперашнія спікеры Савета Рэспублікі і Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу да нядаўняга часу былі губернатарамі Магілёўскай і Віцебскай абласцей, у час размовы былі закрануты тэматыка сацыяльна-эканамічнага развіцця гэтых двух рэгіёнаў, а таксама кадравыя пытанні.

Аляксандр Лукашэнка з задавальненнем канстатаваў, што Магілёўская вобласць дэманструе пэўную пазітыўную дынаміку і сёння яе важна не страціць.

На думку кіраўніка дзяржавы, выбранне Барыса Батуры і Уладзіміра Андрэйчанкі на пасады кіраўнікоў палат парламента «з'яўляецца ўдачным выбарам».

Старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Барыс Батура падкрэсліў, што ў верхняй палаце беларускага парламента поўнасцю вырашаны арганізацыйныя пытанні, наладжана работа ў адпаведнасці з планам падрыхтоўкі законапраектаў у краіне.

Было адзначана, што дзейнасць сенатараў у Беларусі выбудоўваецца па чатырох асноўных напрамках. Гэта, у прыватнасці, заканатворчасць, узаемасувязь з мясцовым самакіраваннем, міжнародныя і міжпарламенцкія кантакты, а таксама работа з насельніцтвам.

Барыс Батура выказаў упэўненасць, што Савет Рэспублікі выканае сваю галоўную задачу — працаваць над стварэннем стабільнай заканадаўчай базы, якая ўлічвае інтарэсы ўсіх слаёў насельніцтва.

Старшыня Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Уладзімір Андрэйчанка праінфармаваў аб выніках работы першай сесіі дэпутатаў.

Прэзідэнт адзначыў важнасць захавання пераемнасці ў рабоце Палаты прадстаўнікоў. Але ў той жа час неабходна ўкараняць новыя ідэі і падыходы, лічыць Аляксандр Лукашэнка.

Кіраўнік дзяржавы звярнуў асаблівую ўвагу на якасць прымаемых законапраектаў. Як было адзначана, вельмі важна падтрымліваць канструктыўнае ўзаемадзеянне паміж усімі ўдзельнікамі заканатворчага працэсу ў краіне.

Аляксандр Лукашэнка таксама падкрэсліў, што міжнародная дзейнасць Палаты прадстаўнікоў павінна быць шматвектарнай.

Прэзідэнт заклікаў дэпутатаў падтрымліваць больш цесную сувязь са сваімі выбаршчыкамі і з мясцовымі Саветамі.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Прэзідэнт Беларусі накіраваў спачуванні ў сувязі з ахвярамі ў выніку ўзрыву жылога дома ў Еўпаторыі

У сувязі з узрывам жылога дома ў Еўпаторыі, які прывёў да чалавечых ахвяраў, Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка 25 снежня ад імя беларускага народа і сябе асабіста накіраваў спачуванні Прэзідэнту Украіны Віктару Юшчанку, а таксама родным і блізкім загінулых.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Указ Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь № 708

Аб назначэнні П.М. Рудніка старшынёй Магілёўскага аблвыканкама

Назначыць **РУДНІКА Пятра Міхайлавіча** старшынёй Магілёўскага аблвыканкама і прысвоіць яму вышэйшы клас дзяржаўнага служачага.

Унесці кандыдатуру П.М. Рудніка на зацвярджэнне Магілёўскага абласнога Савета дэпутатаў.

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь А. ЛУКАШЭНКА

29 снежня 2008 г., г. Мінск.

Біяграфія РУДНІКА Пятра Міхайлавіча

Фота БЕЛТА.

Руднік Пётр Міхайлавіч нарадзіўся ў 1957 годзе ў в. Аляксееўка Брагінскага раёна Гомельскай вобласці. У 1985 годзе скончыў Дрэздэнскі тэхнічны ўніверсітэт, а ў 2007 годзе — Акадэмію кіравання пры Прэзідэнце Беларусі.

Працаваў на магілёўскім вытворчым аб'яднанні «Тэхнаприбор», у будаўнічых арганізацыях Магілёва, на Магілёўскім ліфтабудаўнічым заводзе.

З 1995 па 2000 год займаў пасаду намесніка дырэктара завода «Магілёўліфтмаш». З 2000 па 2003 год быў камерцыйным дырэктарам Магілёўскага завода ліфтавага машынабудавання, а з 2003 года ўзначаліў гэта прадпрыемства. 29 снежня 2008 года назначаны старшынёй Магілёўскага аблвыканкама. Узнагароджаны медалём «За працоўныя заслугі».

Добрая справа — традыцыя калядных святаў

Ва ўнівермагу «Цэнтральны» ў Магілёве ўсталяваная спецыяльная ёлка, на якой замест традыцыйных упрыгажэнняў развешаныя фотаздымкі выхаванак Магілёўскай інтэрнат-гімназіі для дзяўчатак-сірот і дзяўчатак, якія засталіся без апекі бацькоў. Разам з выявамі дзяцей на ёлцы — іх расповеды пра шчасце і калядныя мары. Валанцёры заклікалі неабыякавых людзей да добрай справы: зрабіць дзіцяці падарунак да свята. Акцыю «Цуды на Каляды» арганізавалі Магілёўскія абласныя арганізацыі Чырвонага крыжа і БРСМ, праваслаўныя епархіі. За дзесяць дзён у акцыі ўзялі ўдзел некалькі соцень магіляўчан.

Алена КАЗЛОВА.

Маразы і Снягуркі, на парад!

У Віцебску ўпершыню прайшло шэсце з удзелам Дзядоў Маразоў і Снягурак — а ўсяго іх болей за сто чалавек. Ішлі казачныя героі па галоўных вуліцах горада пад гукі духавога аркестра. За імі — лепшыя спартсмены. А напрыканцы парада ехала калона святочна ўпрыгожаных машын — спецыяльнай тэхнікі МНС, хуткай дапамогі, таксі, пошты... Вадзіцелі таксама былі апранутыя ў касцюмы Дзедаў Маразоў. Нават дарожны рух рэгулявалі Дзяды Маразы — супрацоўнікі ДАІ.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

Выканкам АБФФ назваў лаўрэатаў футбольнага сезона-2008

Лепшым футбалістам краіны чацвёрты раз запар стаў капітан нацыянальнай зборнай Беларусі, паўабаронца іспанскай «Барселоны» Аляксандр Глеб. Форвард пяціразовага чэмпіёна краіны барысаўскага БАТЭ Віталь Радзівонаў прызнаны лепшым гульцом 18-га чэмпіянату краіны. Ён разам са сваім партнёрам па камандзе Генадзем Блізнюком стаў мацнейшым і ў спрэчцы бамбардзіраў. Лепшым вратаром сезона названы Сяргей Вярэмка, абаронцам — Сяргей Сасноўскі, а Сяргей Крывец стаў лаўрэатам у намінацыі «За футбольны талент і самаадданасць ў гульні за Беларусь». Акрамя таго, настаўніку БАТЭ Віктару Ганчарэнку не было роўных сярод галоўных трэнераў. Лепшымі арбітрамі краіны прызнаны Аляксей Кульбакоў, Віталь Малюцін і Станіслаў Савіцкі.

БЕЛТА.

ПТУШКІ БЕЛАРУСІ. СОВЫ

22 снежня 2008 года Міністэрства сувязі і інфарматызацыі Рэспублікі Беларусь уводзіць у паштовае абарачэнне чатыры маркі з серыі «Птушкі Беларусі. Совы», падрыхтаваныя ВЦ «Марка» РУП «Белпошта».

Мастакі Лілія Гардзеева і Іван Лукін.



Новыя манеты папоўнілі дзве серыі

Нацыянальны банк увёў у абарачэнне яшчэ дзве памятныя манеты — «Сядоў» новай серыі «Парусныя караблі» і «Заказнік «Ліпічанская пушча» серыі «Заказнікі Беларусі», паведаміў прэс-сакратар галоўнага банка краіны Міхаіл Журавовіч.

Першая манета адчаканена наміналам 20 рублёў — сярэбраная і 1 рубель — медна-нікелевая. Адчаканены яны на АТ «Манетны двор Польшчы». Сярэбраная манета «Заказнік «Ліпічанская пушча» выпушчана наміналам 20 рублёў, медна-нікелевая — наміналам 1 рубель. Яны адчаканены на РДП «Казахстанскі манетны двор Нацыянальнага банка Рэспублікі Казахстан».

Ігар ГРЫШЫН.

ЗАПРАШАЕ КАЛЯДНЫ КІРМАШ

Перадсвяточныя дні нашы продкі традыцыйна праводзілі на калядных кірмашах.

Фота Мікалая ЦЕЛЯХОВІЧА.

Беларуская праваслаўная царква і Выставачнае прадпрыемства «Экспафорум» запрашае ўсіх ахвотных на 7-ю духоўна-асветную выставу-кірмаш «Нараджэнне Хрыстова», якая адкрылася 27 снежня і працягнецца да 5 студзеня па адрасе: праспект Пераможцаў, 14. Удзельнікі выставы — дзясяткі манастыроў, праваслаўных прыходаў, выдавецтваў з Беларусі, Расіі, Украіны, а таксама Іерусалімскі Грэчаскі манастыр св. Феадора Страцілата (Ізраіль).

Выстава «Нараджэнне Хрыстова» — гэта не проста кірмаш, гэта яшчэ і багатая культурна-асветніцкая праграма. 30 снежня ў яе рамках адбудзецца семінар «Праваслаўныя СМІ ў інфармацыйнай прасторы Беларусі», 2 студзеня — сустрэча з анкахворымі дзецьмі і прэзентацыя новага зборніка дзіцячага літаратурна-творчага аб'яднання «Дрэва жыцця» пры анка-гематалагічным цэнтры. На 3 студзеня запланавана прэзентацыя кнігі Ірыны Клышэўскай «Паездка ў Глыбокае». Нараджэнню дзяцей як неабходнай умове працвітання беларускай сям'і і дзяржавы будзе прысвечаны «круглы стол» у панядзелак, 5 студзеня. У ім возьмуць удзел не толькі святары, але і медыкі.

Штодня а шостай гадзіне вечара на выставе праходзяць «Калядныя вечары», на якіх ёсць магчымасць сустрэцца з лепшымі музычнымі калектывамі, царкоўнымі хорамі і паэтычнымі праграмамі. Асаблівая ўвага тут — дзецям: для іх створана гульнявая пляцоўка, ім прысвечана асноўная частка праграмы, ды і самі яны — актыўныя ўдзельнікі кірмашу.

Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.

ISSN 1990 - 763X

РОЗГАЛАС

АПОШНЯЯ ІНФАРМАЦЫЯ СУТАК

НА СВЯТА НЕВЯЛІКІ МАРОЗ, ПОТЫМ — ДА -20

У апошнія дні адыходнага года надвор'е ў Беларусі будзе вызначаць зона павышанага ціску. Таму ападкаў амаль не будзе, толькі ўдзень у сераду па поўначы краіны пройдзе невялікі снег, паведаміў рэдакцыі начальнік службы гідраметэапрагнозаў Рэспубліканскага гідраметцэнтра Дзмітрый Рабаў.

Заўтра ў асобных раёнах туман, слабы галалёд, на дарогах галалёдзіца. Тэмпература паветра ўдзень ад мінус 4 да плюс 1 градуса. У навагоднюю ноч надвор'е будзе вызначаць атмасферны фронт, таму ў многіх раёнах пройдзе кароткачасовы снег, слабая мяцеліца, на дарогах галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы і ў першы дзень новага года 2—9 градусаў марозу. А вось з пятніцы на тэрыторыю нашай краіны пачне паступаць халоднае арктычнае паветра, і маразы ўзмоцняцца. Тэмпература паветра ўначы да канца тыдня будзе ў межах 7—13 марозу, пры праясненнях да мінус 16 градусаў, а ў ноч на нядзелю пры праясненнях — ажно да 18—20 марозу. Цяпер вышыня снежнага покрыва складае ад аднаго сантыметра па захадзе краіны да 16 сантыметраў у Магілёўскай вобласці. Сіноптыкі паведамляюць, што ў суботу і нядзелю сярэднясутачная тэмпература паветра будзе прыкладна на 2—5 градусаў ніжэйшая за кліматычную норму.

Сяргей КУРКАЧ.

ШТО БУДЗЕ З ТРАНСПАРТАМ У НАВАГОДНЮЮ НОЧ?

Паводле інфармацыі КУП «Мінсктранс», у сталіцы транспартнае абслугоўванне насельніцтва будзе арганізавана наступным чынам.

1 студзеня з 0.00 да 5.30 з інтэрвалам 15 хвілін будзе арганізавана праца аўтобусных маршрутаў камунальнага пасажырскага транспарту: №1 «ДС Вяснянка — Вакзал», №27 «ДС Ангарская-4 — Сасновы Бор», №91 «АВ Маскоўскі — Вяснянка», №95 «ДС Славінскага — Сцяпянка», №100 «Аэрапорт «Мінск-1» — АВ Маскоўскі»; тралейбусных №1 «ДС Зялёны Луг-7 — АВ Маскоўскі», №13 «ДС Захад-3 — Гарадскі Вал», №41 «Малініна — ДС Уручча-2», №65 «ДС Малінаўка-4 — Дружная»; трамвайных №1 «Пл. Мясніка — Зялёны Луг», №6 «Серабранка — Зялёны Луг».

З інтэрвалам 15 хвілін у навагоднюю ноч 1 студзеня з 0.00 да 3.30 будзе арганізавана праца аўтобусных маршрутаў №29 «ДС Куцаўшчына — Кульман», №42 «ДС Куцаўшчына — Сухарава-6», №52 «ДС Лошыца — Вакзал», №72 «ДС Шабаны — АС Аўтазаводская», №73 «ДС Сярова — Вяснянка», №99 «ДС Уручча-4 — 9-км», №113 «АВ Маскоўскі — Тубдыспансэр» (інтэрвал — 30 мінут), №121 «ДС Куцаўшчына — Сухарава-6»; тралейбусных №26 «Чыжоўка — Кабушкіна», №27 «ДС Дружная — Курасоўшчына», №45 «ДС Паўднёвы Захад — ДС Дружная», №48 «Сухарава — ДС Куцаўшчына», №51 «ДС Дружная — Курасоўшчына», №53 «ДС Малінаўка-4 — ДС Зялёны Луг-7», №60 «ДС Ангарская-4 — Ст.м. Магілёўская», №62 «ДС Уручча-2 — ДС Уручча-4». Метрапалітэн 1 студзеня будзе працаваць да 3 гадзін.

Сяргей РАСОЛЬКА.

ШУМАІЗАЛЯЦЫЙНЫ ШЧЫТ СТАЎ ПРЫЧЫНАЙ ГІБЕЛІ ЧАРАДЫ АМЯЛУШАК

Больш за 180 амялушак у мінулую нядзелю загінулі ў Брэсце, паведамілі ў Брэсцкай гаррайінспекцыі прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя. Прычынай гібелі чарады птушак стаў шумаізаляцыйны шчыт, усталяваны на прыпынку аўтатранспарту ў раёне завода «Брэстгазаапарат».

Празрысты пластык, закліканы засцерагчы ад шуму канцавога прыпынку аўтатранспарту найбліжэйшыя жылыя дамы, тут усталяваны зусім нядаўна.

Чародку амялушак, якая прыляцела паласавацца рабінай, выпадкова спалохалі. Птушкі рэзка ўзляцелі, але трапілі проста ў празрысты пластык і, быццам гарошыны, сталі падаць на асфальт. На месца здарэння выклікалі МНС і спецыялістаў інспекцыі прыродных рэсурсаў. На жаль, большая частка птушак загінула, астатніх выходжваюць ветэрынары. Як адзначылі ў інспекцыі, гэтай трагедыі можна было пазбегнуць, калі б на шчыт былі наклеены элементы запалохвання. Менавіта з такім патрабаваннем мае намер звярнуцца прыродаахоўная арганізацыя ў гарадскую адміністрацыю.

Фота БЕЛТА.

Вольга КАБЯК, БЕЛТА.

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 30.12.2008 г. (для б/н разлікаў)

1 долар ЗША	2 200,00
1 еўра	3 077,14
1 латвійскі лат	4 354,28
1 літоўскі літ	890,98
1 чэшская крона	116,43
1 польскі злоты	749,88
1 расійскі рубель	76,89
1 украінская грыўня	273,29

Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў Цэнтрабанк РФ

USD	29,2300
10 UAH	38,7152
1000 BYR	13,2803
EUR	41,6294

Курс у гандлёвых кампаніях (на 29.12.2008 г.)

USD ..... 2250 / 2300

Агенцтва Уладзіміра Граўцова

Падпішыцеся на часопіс «Главный Бухгалтер. ГБ» на 2009 год у рэдакцыі па самай выгаднай цане. Тэлефон рэдакцыі: 209-69-01.

ААТ «Агенцтва Уладзіміра Граўцова» УНП 100024047 Ліцэнзія Мінсувязі № 02140/0172806 выд. 03.05.2004 да 02.05.2009

белагропромбанк
традиции будущего

ТАБЛИЦА ПРОЦЕНТНЫХ СТАВОК ПО СРОЧНОМУ БАНКОВСКОМУ ВКЛАДУ (ДЕПОЗИТУ) ОАО «БЕЛАГРОПРОМБАНК» с 30 декабря 2008 г.

Сумма депозита, ед. валюты	Вклады (депозиты) с плавающими процентными ставками, % годовых: Срок, дни 100	200	300	500	1 000	2 000	3 000	Вклады (депозиты) с фиксированными процентными ставками, % годовых: Срок, дни 100	200	300	500	1 000	2 000
Белорусские рубли													
1 – 1 000 000	10,25	12,25	15,00	16,00	16,50	17,00	17,50	8,50	9,80	11,60	11,90	12,20	12,50
1 000 001 – 10 000 000	10,75	12,75	15,50	16,25	16,75	17,25	17,75	8,60	9,90	11,70	12,00	12,30	12,75
10 000 001 и более	11,25	13,25	16,00	16,50	17,00	17,50	18,00	8,70	10,00	11,80	12,10	12,40	13,00
Доллары США													
1 – 500	5,50	9,50	10,00	10,50	11,00	11,30	11,60	4,50	6,50	8,00	8,50	9,00	9,50
501 – 5 000	6,00	9,75	10,25	10,75	11,15	11,45	11,75	5,00	7,00	8,25	8,75	9,25	9,70
5 001 и более	6,50	10,00	10,50	11,00	11,30	11,60	12,00	5,50	7,50	8,50	9,00	9,50	10,00
Евро													
1 – 500	5,50	9,50	10,00	10,50	11,00	11,30	11,60	4,50	6,50	8,00	8,50	9,00	9,50
501 – 5 000	6,00	9,75	10,25	10,75	11,15	11,45	11,75	5,00	7,00	8,25	8,75	9,25	9,70
5 001 и более	6,50	10,00	10,50	11,00	11,30	11,60	12,00	5,50	7,50	8,50	9,00	9,50	10,00
Российские рубли													
1 – 15 000	5,50	9,00	10,50	11,00	11,30	11,60	11,90	4,50	6,50	7,00	7,50	8,00	9,00
15 001 – 150 000	6,00	10,00	10,75	11,15	11,45	11,75	12,00	5,00	6,75	7,25	7,75	8,50	9,50
150 001 и более	6,50	10,50	11,00	11,30	11,60	11,90	12,50	5,50	7,00	7,50	8,00	9,00	10,00

КОНТАКТ-ЦЕНТР БАНКА 136

время работы 8.00-20.00 без выходных и праздничных дней;
звонок со стационарного телефона - бесплатно на территории РБ;
звонок с мобильного телефона (БеСТ, Velcom, МТС) - по тарифам операторов мобильной связи.

www.belapb.by

Лицензия на осуществление банковской деятельности от 27.10.2006 № 2 выдана Национальным банком Республики Беларусь. УНП 100693551.

Беларуская дзяржава зробіць усё магчымае для здароўя і шчасця дзяцей

Аб гэтым заявіў Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Лукашэнка 26 снежня на навагоднім дабрачынным свяце для дзяцей у рамках акцыі «Нашы дзеці».

«Мы, дарослыя і ўся беларуская дзяржава, будзем рабіць усё для таго, каб вы маглі расці здаровымі, разумнымі, шчаслівымі і прыгожымі», — сказаў Прэзідэнт, звяртаючыся да дзяцей, якія сабраліся ў Палацы Рэспублікі. На галоўную ёлку краіны былі запрошаны 2370 дзяцей ва ўзросце ад 8 да 14 гадоў з усіх рэгіёнаў Беларусі. Гэта дзеці-сіроты і дзеці, якія засталіся без апекі бацькоў, выхоўваюцца ў апякунскіх і прыёмных сем'ях, дзеці з сем'яў бежанцаў, вучні — пераможцы міжнародных, рэспубліканскіх і рэгіянальных алімпіяд, творчых конкурсаў, фестываляў, спартыўных спаборніцтваў, а таксама навучэнцы, якія дасягнулі поспеху ў грамадскай рабоце. Прэзідэнт падкрэсліў, што ўжо сёння кожны з іх сваімі добрымі ўчынкамі і добрай вучобай упісвае радкі ў летапіс краіны. Кіраўнік дзяржавы нагадаў, што будучы год азнаменаваны 65-годдзем вызвалення Беларусі ад фашызму, і таму заклікаў дзяцей памятаць пра народны подзвіг, а таксама сказаў, што дарослыя зробяць усё, каб такое няшчасце больш не паўтарылася.

Аляксандр Лукашэнка павіншаваў усіх дзяцей з надыходзячым Новым годам. «Новы год — вельмі светлае свята, таму што накіравана ў будучыню. Яно дорыць нам надзею на лепшае, на выкананне задуманага. Марце, загадвайце неверагодныя жаданні, стаўце высокія мэты! Бо на самай справе жаданні — гэта прадчуванне нашых магчымасцяў. А значыць, іх ажыццяўленне ў многім залежыць ад нас», — падкрэсліў Прэзідэнт.

Пасля завяршэння казачнага навагодняга паказу, што разгарнуўся на сцэне Палаца Рэспублікі, усім дзецям ад імя Прэзідэнта Беларусі ўручылі падарункі.

Аляксандр Лукашэнка захаваў дзеючы парадак падаткаабкладання ІП пры ўвозе імі тавараў з Расіі

Умовы падаткаабкладання індывідуальных прадпрымальнікаў у Беларусі часткова зменены. Прэзідэнт Беларусі 24 снежня выдаў указ № 703, якім унёс дапаўненні і змяненні ў некаторыя ўказы, што датычацца рэгулявання прадпрымальніцкай дзейнасці.

Кіраўнік дзяржавы зняў абмежаванне па перыяду дзеяння вызвалення ад мытнага афармлення і абкладання мытнай пошлінай (зборамі) пры ўвозе на тэрыторыю Беларусі тавараў, што паходзяць з трэціх краін і выпушчаны ў свабоднае абарачэнне ў Расійскай Федэрацыі, адносна індывідуальных прадпрымальнікаў — плацельшчыкаў адзінага падатку, якія ажыццяўляюць рознічны гандаль. Указам захаваны дзеючы парадак выплаты падатку на дабаўленую вартасць у фіксаванай суме індывідуальнымі прадпрымальнікамі — плацельшчыкамі адзінага падатку, па ўвезеных імі на тэрыторыю Беларусі з тэрыторыі Расіі таварах без адпаведных дакументаў. У той жа час узмоцнена адказнасць індывідуальных прадпрымальнікаў, якія з'яўляюцца плацельшчыкамі адзінага падатку, за ажыццяўленне дзейнасці без атрымання спецыяльных дазволаў (ліцэнзій) або нявыплату гэтага падатку і (або) падатку на дабаўленую вартасць у фіксаванай суме.

У мэтах выраўноўвання падатковай нагрузкі індывідуальных прадпрымальнікаў і арганізацый павялічаны максімальныя значэнні базавых ставак адзінага падатку па ўсіх катэгорыях населеных пунктаў.

Пры гэтым павелічэнне базавых ставак не прывядзе да аўтаматычнага павелічэння дзеючых ставак падатку, паколькі канкрэтныя стаўкі падатку ў залежнасці ад відаў рэалізуемых індывідуальнымі прадпрымальнікамі тавараў (работ, паслуг), месца ажыццяўлення дзейнасці і іншых умоў устанаўліваюцца рашэннямі абласных і Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў. Акрамя таго, у гэтых жа мэтах указам прадугледжваецца павелічэнне павышаючага каэфіцыента з 1,5 да 2, які выплачваецца індывідуальнымі прадпрымальнікамі, калі яны рэалізуюць тавары, не выраблены ў Рэспубліцы. Каб забяспечыць адэкватную падатковую нагрузку для індывідуальных прадпрымальнікаў, якія выплачваюць адзіны падатак, у выпадку атрымання імі выручкі, што перасягае 20-разовую суму адзінага падатку, вылічаную за адпаведны каляндарны месяц, з сумы такога перавышэння будзе вылічвацца даплата падатку ў памеры 10 працэнтаў.

Для забеспячэння паўнаты выплаты падаткаў у бюджэт з 1 студзеня 2009 года скарачаецца сфера прымянення сістэмы выплаты адзінага падатку шляхам выключэння з пераліку відаў дзейнасці, пры ажыццяўленні якіх індывідуальныя прадпрымальнікі і іншыя фізічныя асобы выплачваюць адзіны падатак, і базавых ставак адзінага падатку, рознічнага гандлю запаснымі часткамі да аўтамабіляў. Разам з гэтым пералік дапоўнены такімі відамі дзейнасці, як «Прадастаўленне месцаў для кароткачасовага пражывання» і «Перагон аўтамабіляў».

У мэтах легалізацыі дзейнасці фізічных асобаў і спрашчэння парадку іх падаткаабкладання ўказам вызначаны пералік відаў дзейнасці, пры ажыццяўленні якіх не патрабуецца рэгістрацыя фізічных асобаў у якасці індывідуальных прадпрымальнікаў. Гэта паслугі па атрыманні сельскагаспадарчай прадукцыі, драбненні зерня, выпасванні жывёлы, рэпетытарству, чыстцы і прыбіранні жылых памяшканняў, дзённаму догляду дзяцей. Гэтыя віды дзейнасці могуць ажыццяўляцца фізічнымі асобамі па заяўным прынцыпе без дзяржаўнай рэгістрацыі ў якасці індывідуальнага прадпрымальніка, а для спрашчэння падаткаабкладання такія фізічныя асобы аднесены да плацельшчыкаў адзінага падатку. Мінімальная базавая стаўка адзінага падатку па названых у пераліку відах дзейнасці прадугледжана ў нязначных памерах, што разам з заяўным прынцыпам ажыццяўлення дзейнасці будзе садзейнічаць вывядзенню «з цені» і прыцягненню да падаткаабкладання асобаў, якія ажыццяўляюць цяпер сваю дзейнасць нелегальна без выплаты падаткаў.

Для ўрэгулявання парадку выплаты падатку пры адначасовым ажыццяўленні рознічнага гандлю праз гандлёвыя аб'екты і з выкарыстаннем сеткі інтэрнэт прадугледжваецца выплата для інтэрнэт-магазінаў адзінага падатку як па асобным гандлёвым аб'екце.

У мэтах скарачэння колькасці адміністрацыйных працэдур, што ажыццяўляюцца падатковымі органамі, указам прадугледжваецца, што пераход індывідуальнага прадпрымальніка на агульны парадак падаткаабкладання і наадварот будзе ажыццяўляцца без падачы ў падатковы орган заявы. У цэлым рэалізацыя палажэнняў указа будзе садзейнічаць спрашчэнню парадку ажыццяўлення дзейнасці індывідуальных прадпрымальнікаў, якія з'яўляюцца плацельшчыкамі адзінага падатку.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Прэзідэнты Беларусі і Расіі дасягнулі дамоўленасцяў па ўсім комплексе пытанняў двухбаковых адносінаў

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка заклікае прыватны бізнэс больш актыўна інвеставаць у развіццё сацыяльнай сферы. Аб гэтым ён заявіў 23 снежня ў час цырымоніі адкрыцця лядовай арэны ў Бярозе.

У час рабочай паездкі ў Брэсцкую вобласць Прэзідэнт азнаёміўся з выкананнем задач па сацыяльным і эканамічным развіцці рэгіёна, развіццём спорту і будаўніцтвам спартыўных аб'ектаў у вобласці, а таксама з ходам рэканструкцыі і тэхнічным пераазнашчэннем Бярозаўскага КБВ.

Аляксандр Лукашэнка агледзеў басейн, уведзены ў строй у Бярозе месяц таму, а таксама лядовую арэну. Гэтыя аб'екты былі ўведзены па даручэнні кіраўніка дзяржавы. Пры іх будаўніцтве выкарыстоўваліся самыя сучасныя інжынерныя і архітэктурныя рашэнні.

Лядовая арэна разлічана на 576 гледачоў. Акрамя лядовай пляцоўкі тут ёсць барцоўская зала. У гэтым спартыўным збудаванні змогуць праводзіцца рэспубліканскія і міжнародныя спаборніцтвы па хакеі з шайбай, фігурным катанні, барацьбе. Акрамя таго, пры лядовым палацы пачне працаваць і дзіцячаюнацкая спартыўная школа, у якой займацца хакеем і барацьбой змогуць каля 300 дзяцей.

У будаўніцтве як басейна, так і лядовай арэны непасрэдны ўдзел прыняло ТАА «Трайпл», якое ўзначальвае Юрый Чыж.

Як адзначыў Прэзідэнт на цырымоніі адкрыцця лядовай арэны, такая падтрымка з боку прыватнага бізнэсу з'яўляецца добрым прыкладам для астатніх прадпрымальнікаў. «Юрый Чыж стаў піянерам у добрай справе. Я вельмі чакаю, што з яго возьмуць прыклад іншыя прадстаўнікі бізнэсу», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт заклікаў прыватны сектар дапамагчы дзяржаве ў развіцці аб'ектаў сацыяльнай інфраструктуры, асабліва ў малых гарадах і ў вёсцы.

«Хачу, каб людзі разумелі, што дзяржава адна не вырашыць існуючыя праблемы. Я проста прашу бізнэсменаў: укладзіце ў зямлю, хоць бы ў тую, якая вас нарадзіла і паставіла на ногі. Калі кожны бізнэсмен зробіць штосьці для сваёй зямлі, яна стане багацейшай», — падкрэсліў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка з задавальненнем адзначыў, што ў Беларусі паступова выраўноўваецца сацыяльна-эканамічнае развіццё рэгіёнаў.

На яго думку, з уводам такіх спартыўных аб'ектаў у беларускай глыбінцы рэалізуюцца стратэгічныя мэты дзяржавы па выраўноўванні сацыяльна-эканамічнага развіцця рэгіёнаў, паляпшэнні жыцця ў малых гарадах і ў вёсцы, што з'яўляецца адным са складнікаў Дзяржаўнай комплекснай праграмы развіцця рэгіёнаў, малых і сярэдніх гарадскіх паселішчаў.

З узвядзеннем новых аб'ектаў не толькі мяняецца ўклад жыцця, але і ствараюцца новыя рабочыя месцы. Так, напрыклад, з уводам лядовай арэны ў Бярозе будзе створана 60 новых рабочых месцаў. «Вось чаму нават у цяперашні складаны час мы прадаўжаем будаваць такія аб'екты. Яны нам неабходныя як для фарміравання здаровага ладу жыцця, так і для вырашэння праблемы занятасці людзей», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт падкрэсліў, што планы па развіцці сацыяльнай сферы ў Беларусі скарачацца не будуць нават ва ўмовах сусветнага крызісу. «Што не атрымаецца зрабіць за год, мы зробім за два. Але абавязкова зробім», — рэзюмаваў беларускі лідар.

Ён са шкадаваннем канстатаваў, што сусветны фінансавы крызіс закрануў і Беларусь, аднак наша краіна «трымаецца дастойна», і ў выпадку паспяховага пераадолення наступстваў крызісу будзе ў авангардзе сусветнай эканомікі. «Калі мы вытрымаем крызіс, які закрануў і нас, то, як толькі пачне ўзнімацца сусветная эканоміка, мы будзем наперадзе ўсіх», — запэўніў Прэзідэнт.

Галоўнае цяпер, лічыць ён, — прадаць тую прадукцыю, якая вырабляецца ў краіне. «Як бы ні было цяжка, кожны, ад рабочага да губернатара, павінен ведаць: вырабіў — прадай», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы, дадаўшы, што вытворчасць павінна быць лепшай якасці.

«Кожны чалавек павінен напружыцца і вытрымаць будучы год дастойна», — сказаў Прэзідэнт. «Той, хто вытрымае крызіс, будзе самым моцным у гэтым свеце», — перакананы ён. У Беларусі ёсць усё, каб справіцца з гэтымі цяжкасцямі.

Пасля ўрачыстага адкрыцця новай лядовай арэны адбыўся хакейны матч паміж камандамі Прэзідэнта Беларусі і зборнай Брэсцкай вобласці ў рамках другога рэспубліканскага турніру аматараў хакея. Кіраўнік дзяржавы таксама прыняў удзел у матчы, што завяршыўся з лікам 10:7 на карысць каманды Прэзідэнта.

Пасля заканчэння гульні Аляксандр Лукашэнка адказаў на пытанні журналістаў, якіх цікавілі вынікі праведзеных 22 снежня ў Крамлі перагавораў і парадак дня маючага адбыцца ВДС, развіццё далейшага дыялога Беларусі з Захадам ва ўмовах цеснай інтэграцыі з Расіяй. Журналісты папрасілі пракаментаваць Прэзідэнта сваю пазіцыю наконт «зліву» інфармацыі ў расійскіх СМІ напярэдадні сустрэч Аляксандра Лукашэнкі і Дзмітрыя Мядзведзева, а таксама пра неабходнасць большага ўкладу прыватнага бізнэсу ў развіццё сацыяльнай сферы.

Кіраўнік дзяржавы пры гэтым ён адзначыў, што Беларусь гэты крызіс не захлісне.

Прэзідэнт таксама падзякаваў, што Расія пацвердзіла выдзяленне Беларусі ў лютым будучага года другога транша расійскага крэдыту ў аб'ёме $1 млрд для падтрымкі і стабілізацыі беларускага рубля. Ён таксама дадаў, што ў Беларусі назапашаны свае нядрэнныя рэзервы і краіна «пакуль што сябе адчувае спакойна».

Прэзідэнты Беларусі і Расіі абмеркавалі ў Маскве і ўвесь комплекс ваенна-палітычных пагадненняў па ўзмацненні беларуска-расійскай групоўкі на заходнім напрамку ў частцы пераўзбраення і мадэрнізацыі Узброеных Сілаў, перш за ўсё Беларусі. Як лічыць Аляксандр Лукашэнка, у канцы студзеня бакі выйдуць на падпісанне пагаднення аб адзінай сістэме проціпаветранай абароны.

Былі абмеркаваны і палітычныя пытанні, у прыватнасці, магчымасць прызнання Беларуссю незалежнасці Паўднёвай Асеці і Абхазіі. Аднак, паводле слоў кіраўніка дзяржавы, гэтай тэме не ўдзялялася шмат увагі. «Гэта быў толькі штрых у перагаворах, — сказаў беларускі лідар. — Як я ўжо гаварыў, парламент разгледзіць гэта пытанне, і калі будзе на тое воля народа, Прэзідэнт падпіша адпаведныя дакументы». Аляксандр Лукашэнка таксама дадаў, што Беларусь і Расія поўныя рашучасці разам выходзіць са складанай абстаноўкі, якая ўзнікла ў сувязі з крызісам.

Што датычыцца антыбеларускіх інсінуацый шэрагу расійскіх сродкаў масавай інфармацыі, якія з'яўляюцца ўсякі раз напярэдадні сустрэч прэзідэнтаў дзвюх краін, Аляксандр Лукашэнка лічыць, што такія інфармацыйныя правакацыі — «праяўленне імперскага сіндрому».

«Гэты імперскі сіндром не дае жыць некаторым расійскім чыноўнікам. Гэтыя дзеянні банальныя, мы ўжо загадзя ведаем, як яны будуць «зліваць» гэту інфармацыю. Гэта ўжо проста надакучыла. Яны не здольныя прыдумаць нешта новае, але заўсёды падкідваюць, што яны, маўляў, такія вялікія і да іх паўзуць на каленях прасіць», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

Паводле слоў Аляксандра Лукашэнкі, сваю рэакцыю на гэта ён выказаў на сустрэчы з Прэзідэнтам Расіі Дзмітрыем Мядзведзевым у Маскве: Беларусь ні ў якім выпадку не з'яўляецца нахлебнікам і не прыйшла нешта прасіць. «Маё стаўленне да такіх рэчаў вы ведаеце. На гэты раз вельмі жорстка адрэагаваў на такія «злівы» і пагрозы беларускі бок, і вы бачылі, як на наступны дзень змянілася танальнасць у расійскіх сродках масавай інфармацыі», — адзначыў ён.

Прэзідэнт пацвердзіў, што на апошні тыдзень студзеня запланаванага пасяджэнне Вышэйшага Дзяржсавета Саюзнай дзяржавы, дзе будуць прыняты важныя рашэнні, у тым ліку аб падпісанні пагаднення аб адзінай сістэме ППА.

«Парадак дня маючага адбыцца ў канцы студзеня будучага года пасяджэння Вышэйшага Дзяржаўнага Савета Саюзнай дзяржавы будзе напоўнены важнымі і канкрэтным зместам, а не руіннымі пытаннямі, якія можна вырашыць у рабочым парадку», — сказаў Прэзідэнт. Тлумачачы, чаму пасяджэнне ВДС не адбылося, як чакалася, у пачатку снежня гэтага года, ён адзначыў: «Нам прапаноўвалі зусім руіннны парадак дня, які змяшчаў каля 20 пытанняў, але я, абапіраючыся на нашы дамоўленасці з Прэзідэнтам Расіі, што мы не будзем займацца на ВДС пытаннямі «для птушачкі», паспрабаваў аб'яднаць пытанні парадку дня ў вялікія блокі і прапанаваць іх для абмеркавання. Расія аказалася негатовай тады абмяркоўваць парадак дня ў такім выглядзе і папрасіла адтэрмінаваць пасяджэнне».

Прэзідэнт паведаміў, што прапанаваных ім блокаў пытанняў было тры: эканамічны (па іх пазіцыі былі зрабіць справаздачу прэм'ер-міністры), ваенны (даклады павінны былі зрабіць міністры абароны дзвюх краін) і дыпламатычны (у прыватнасці, размова ішла аб сумеснай праграме дзеянняў на міжнароднай арэне МЗС Беларусі і Расіі).

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што Прэзідэнт Расіі згадзіўся з прапановамі беларускага боку. «Мы не паехалі ў Маскву не таму, што не захацелі, а проста таму, што расіяне яшчэ не былі гатовы», — растлумачыў Прэзідэнт Беларусі.

Адказваючы на адно з пытанняў журналістаў, кіраўнік дзяржавы выказаў перакананне ў тым, што далейшы ход інтэграцыі з Расіяй ніяк не паўплывае на адносіны Беларусі з Захадам.

«Прадаўжэнне дыялога з Расійскай Федэрацыяй ніяк не паўплывае на тэндэнцыю паляпшэння адносінаў Беларусі з Захадам. Мы будзем паляпшаць нашы адносіны з Еўропай, і я аб гэтым Дзмітрыю Анатольевічу сказаў», — падкрэсліў кіраўнік беларускай дзяржавы, дадаўшы, што ў гэтым таксама ёсць і вялікая выгада для расійскай дзяржавы. На яго думку, цесны саюз з Расіяй прадвызначаны аб'ектыўнымі фактарамі эканомікі.

«На Захадзе цудоўна гэта разумеюць, ды і я ім не раз гаварыў, што мы не збіраемся адварочвацца ад Расіі. Таму яны ад нас нічога такога і не патрабуюць», — адзначыў Прэзідэнт.

«Еўрапейцы цудоўна ведаюць нашы адносіны з Расійскай Федэрацыяй. На ўсіх перагаворах мы папярэджвалі іх, што ні ў якім выпадку не спрабуем выбудоўваць нашы адносіны з Захадам за кошт Расіі і наадварот. Мы не збіраемся гуляць у нейкія гульні ў гэтым напрамку», — рэзюмаваў Аляксандр Лукашэнка.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

ГЕНПАДРАДЧЫКАМ БУДАЎНІЦТВА АЭС У БЕЛАРУСІ ВЫСТУПІЦЬ КАМПАНІЯ РАСАТАМ

Аб гэтым паведаміў дырэктар дэпартамента па развіцці ядзернай энергетыкі Міністэрства энергетыкі Беларусі Мікалай Груша, перадае карэспандэнт БЕЛТА. Перагаворы з расійскім бокам па гэтым пытанні адбудуцца ў пачатку 2009 года.

Абзац

■ Колькасць насельніцтва Беларусі на 1 снежня гэтага года склала 9 млн 673,4 тыс. чалавек. Як паведаміла прэс-сакратар Нацыянальнага статыстычнага камітэта Алена Кандраценка, у параўнанні з 1 снежня мінулага года жыхароў краіны стала менш на 18,2 тыс. чалавек. За мінулы год колькасць насельніцтва павялічылася толькі ў Мінску — з 1 млн 812,5 тыс. чалавек да 1 млн 826,8 тыс. У астатніх рэгіёнах рэспублікі жыхароў стала менш.

■ **У г. п. Гарадзішча Баранавіцкага раёна перад Калядамі абрабавалі мясцовага святара. Калі пасля службы ён вярнуўся з царквы, то ўбачыў, што на дзвярах няма замка і нехта пабываў у хаце — рэчы былі пераскіданыя, узламаныя замкі на шафе. Аператыўнікам святар паведаў, што знікла 12 тысяч долараў, залатыя вырабы, тры старадаўнія і вельмі каштоўныя абразы і іншыя рэчы. Нешта падобнае ўжо здаралася ў Баранавічах. Тады знікла 27 млн рублёў і золата з дыяментамі — ахвяраванні прыхаджан на ўзвядзенне царквы. Цікавы момант: каштоўнасці былі ўкладзеныя сярод белага дня, а дом святара — у цэнтры Гарадзішча, але зладзеяў ніхто не бачыў.**

■ 80-гадовы пенсіянер з Баранавічаў вырашыў падрыхтавацца да святаў і папрасіў дзвюх жанчын, каб яны дапамаглі яму навесці парадак у кватэры. Жанчыны ўсё вымылі, вычысцілі ды і пайшлі. А неўзабаве дзед убачыў, што зніклі 380 тысяч рублёў і 100 долараў. Адну кабету міліцыя затрымала, і тая адразу ж расказала, што бачыла, як грошы ўкрала яе напарніца. Затрымалі і другую.

■ **У пенсіянеркі з в. Прыборава Брэсцкага раёна супрацоўнікі міліцыі і памежнікі знайшлі петардаў на 120 млн рублёў. Піратэхнічныя вырабы імпартнай вытворчасці канфіскаваныя. І ў жыхара Брэста таксама забралі 17 671 петарду. Тавар беспрацоўны прадаваў без дакументаў.**

■ Начальнік РАУС Віцебскага раёна асабіста затрымаў двух грамадзян, якія незаконна высеклі ў лесе 12 елак вышынёй да 1,5 метра. Гэты лясны тавар зараз вельмі запатрабаваны. Хацелі трохі зарабіць на продажы, але... — Я ехаў на службовым аўтамабілі па дарозе Віцебск — Орша, — расказвае начальнік міліцыі Уладзімір Фралоў. — Ля вёскі Сакольнікі гляджу — двое мужчын нясуць нешта загорнутае ў матэрыю. Спыніўся і ўбачыў, што нясуць 12 елачак. Безумоўна, затрымаў... У РАУС высветлілі, што елкі незаконна высеклі 41-гадовы беспрацоўны жыхар абласнога цэнтра і ягоны пасынак — школьнік. Супрацоўнікі лясгаса склалі пратакол. Рашэннем суда «дрывасекі» могуць быць аштрафаваныя на суму ў памеры ад 20 да 50 базавых велічынь.

■ **На аўтамагістралі Баранавічы—Ляхавічы, каля в. Дарава, у 20.15 вечара жыхар в. Карані наехаў на пенсіянера, які ішоў па краі дарогі. Чалавек загінуў. У гэты ж час у в. Пяскі Бярозаўскага раёна пад коламі «Фольксвагена» загінула 32-гадовая жанчына гэтай жа вёскі. А нейкай гадзінай раней на жыхара в. Жарабковічы наехаў маршрутны аўтобус каля в. Вялікая Гаць Івацэвіцкага раёна. П'яны пешаход апынуўся ў бальніцы. Усе, хто трапіў пад колы, не мелі святлоадбівальных элементаў.**

Поўны абзац

У Башкірыі мужчына абакраў сямейную пару, пакуль яна свярлася. Супрацоўнікі патрульна-паставой службы сярод ночы спынілі чалавека, які падазрона аглядваўся і нёс у руках тры вялікія пакеты. Пры аглядзе міліцыянеры знайшлі ў яго жаночае футра, посуд і прадукты харчавання. Чалавек не мог дакладна патлумачыць, што знаходзіцца ў пакетах і каму ўсё гэта належыць. У міліцыі ён патлумачыў, што ішоў у госці да знаёмага і пачуў гучныя галасы людзей, што сварыліся. З цікаўнасці ён зазірнуў у расчыненыя дзверы і ўбачыў ля парога тры вялізныя пакеты з рэчамі. Не адолеўшы спакусы, мужчына ўзяў іх і збег. Каб праверыць гэту версію, міліцыянеры разам з затрыманым адправіліся на месца здарэння. Праз дзве гадзіны сужэнцы ўсё яшчэ лаяліся, і толькі з'яўленне міліцыі прымусіла іх змоўкнуць. Аказалася, што жонка паведаміла мужу пра тое, што сыходзіць ад яго, і сабрала свае самыя каштоўныя рэчы. У выніку адбыўся буйны скандал, падчас якога сямейнікі не заўважылі, што іх абакралі. Пазнаўшы свае рэчы, абодва так узрадаваліся, што памірыліся.

УП «Минский городской центр недвижимости»

ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

по продаже обращенного в доход государства помещения неустановленного назначения (холодильная станция) с инвентарным номером 500/D-70773089 общей площадью 362,4 кв. м, (балансодержатель – ОАО «Камволь»), расположенного в здании административно-хозяйственном по адресу: г. Минск, ул. Маяковского, 176.

Начальная цена – 693 000 000 белорусских рублей.

Отвод земельного участка будет осуществляться в установленном порядке Минской городской землеустроительной и геодезической службой.

К участию в аукционе допускаются юридические и физические лица, предоставившие организатору аукциона следующие документы:

заявление на участие в аукционе; заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, условиями проведения аукциона; нотариально заверенные копии учредительных документов (для юридических лиц) и свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах); заверенную банком копию платежного поручения, подтверждающего внесение задатка; а также иные документы в соответствии с условиями проведения аукциона.

Задаток в размере 65 000 000 белорусских рублей перечисляется на расчетный счет УП «Минский городской центр недвижимости» № 3012024570010 в филиале ОАО «БПС-Банк» по Минской области, г. Минск, бульвар им. В. Мулявина, 6, код 153001331; УНП 190398583.

Победителем торгов признается участник, предложивший наивысшую цену за продаваемый объект. Порядок проведения торгов указан в условиях проведения аукциона.

Оплата объекта осуществляется в течение 2-х месяцев и 25 календарных дней с даты проведения аукциона. Аукцион состоится **30 января 2009 года** в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Заявления на участие в аукционе и необходимые документы принимаются по **29 января 2009 года** до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. № 6.

Телефон для справок: (017)227 48 36.

НАРАДЖЭННЕ РЭСПУБЛІКІ

Утварэнне Беларускай ССР: унутраныя і знешнія фактары

Нацыянальнае пытанне, як і аграрнае, былі самымі вострымі і надзённымі з самага пачатку ўсталявання бальшавіцкага праўлення ў кастрычніку 1917 г. у Расіі, на яе ўскраінах, у тым ліку ў Беларусі. Таму гэта знайшло адлюстраванне ў самых першых дзяржаўных актах новай улады. Прынятыя дакументы — «Дэкларацыя правоў народаў Расіі», «Дэкларацыя правоў працоўнага і эксплуатуемага народу» і іншыя — закладвалі асновы савецкай нацыянальнай палітыкі.

Гібкасці і нават прываблівасці бальшавіцкай нацыянальнай палітыкі для часткі працоўнага насельніцтва ў першыя гады савецкага праўлення садзейнічала дзяржаўнае будаўніцтва на нацыянальных ускраінах у форме савецкіх рэспублік. Гэтым самым не толькі пэўным чынам задавальняліся нацыянальныя памкненні некаторых пластоў насельніцтва, але і ствараліся аснова для ўмацавання савецкай улады, пашырэнне яе сацыяльнай апоры.

Зыходзячы з гэтых і іншых падыходаў, ужо ў снежні 1917 г. узнікла Украінская савецкая рэспубліка, а да канца лістапада 1918 г. былі створаны савецкія рэспублікі ў Эстоніі, Латвіі, Літве. Беларусь пакуль выпадала з гэтага ланцуга па прычыне акупацыі значнай яе часткі нямецка-кайзераўскімі войскамі, а таксама пазіцыі яе бальшавіцкіх кіраўнікоў, у першую чаргу А. Мяснікова, якія, уваходзячы ў выканаўчы савецкі орган — Аблвыкамзах, лічылі, што існаванне нацыянальных рэспублік раз'ядноўвае сілы працоўных і наносіць шкоду інтарэсам сусветнай рэвалюцыі.

У той час, ва ўсякім разе ў канцы лістапада 1918 г., калі кайзераўскія войскі ў сувязі з рэвалюцыяй у Германіі пакідалі Беларусь і сюды ўступалі фарміраванні Чырвонай Арміі, гэтыя намеры кіраўнікоў Аблвыкамзаха супадалі з пазіцыяй дзяржаўных органаў РСФСР і кіраўніцтва РКП(б). Пацвярджэннем гэтаму з'яўляецца тэлеграма У. Леніна галоўнакамандуючаму савецкімі рабоча-сялянскімі войскамі І. Вацэцісу. Яна была накіравана 29 лістапада 1918 г. У ёй гаварылася: «С продвижением наших войск на запад и на Украину создаются областные временные Советские правительства, призванные укрепить Советы на местах. Это обстоятельство имеет ту хорошую сторону, что отнимает возможность у шовинистов Украины, Литвы, Латвии, Эстляндии рассматривать движение наших частей, как оккупацию, и создает благоприятную атмосферу для дальнейшего продвижения наших войск. Без этого обстоятельства наши войска были бы поставлены в оккупированных областях в невозможное положение, и население не встречало бы их, как освободителей. Ввиду этого просим дать командному составу соответствующих воинских частей указание о том, чтобы наши войска всячески поддерживали временные Советские правительства Латвии, Эстляндии, Украины и Литвы, но, разумеется, только Советские правительства».

БССР з'явілася формай дзяржаўнасці беларускага народа і ўзнікла на пераломным этапе яго гісторыі, адлюстроўваючы волю працоўнага люду і тых шматлікіх прадстаўнікоў нацыянальнай інтэлігенцыі, якія яе непасрэдна праводзілі ў жыццё.

Змест тэлеграмы, напісанай, як вядома, І. Сталіным з дапаўненнямі У. Леніна, не можа не выклікаць пытанне: чаму ў ёй не згадваецца Беларусь, якая была ў цэнтры двойчы пералічаных у яе тэксце тэрыторый.

Такі падыход не падзялялі нацыянальныя беларускія дзеячы, якія ўваходзілі ў Белнацкам і ў беларускія секцыі РКП(б). Аб гэтым, у прыватнасці, сведчыў В. Кнорын, які па гарачых слядах падзей, у верасні—кастрычніку 1918 г. падрыхтаваў і ўпершыню надрукаваў у газеце «Звезда» артыкул «Восемь месяцев Советской Белоруссии». У ім сцвярджалася, што бальшавікі, аб'яўляючы самастойную БССР, супрацьпастаўлялі яе БНР, не дапускаючы магчымасці выкарыстання праціўнікамі закліку самавызначэння народаў. Па словах аўтара артыкула, Дз. Жылуновіч і яго паплечнікі не маглі прымірыцца з такой палітыкай, таму што для іх «самастойнасць Беларусі не была толькі пустым гукам». Група камуністаў-беларусаў, на думку аўтара, «да мазга касцей была прасякнута ідэяй нават не тэрытарыяльнай, а беларуска-нацыянальнай дзяржаўнасці... Для іх, у большасці былых грамадаўцаў (Дыла, Квачанюк, Фальскі і іншыя), зусім не зразумелай была інтэрнацыяналісцкая палітыка Камуністычнай партыі (бальшавікоў) Беларусі, і яны (Жылуновіч, Шантыр і інш.) задаваліся думкаю арганізацыі ў працівагу ёй сваёй беларускай Камуністычнай партыі...». Далей В. Кнорын канстатаваў, што ўся савецкая іх дзейнасць была падпарадкавана задачам нацыянальным. Гэта ўжо выявілася пры арганізацыі самога ўрада.

Іх пазіцыя ў рэшце рэшт стала важкім унутраным фактарам, да якога прыслухаліся кіраўнікі РКП(б) і РСФСР. Паказальная ў гэтых адносінах размова па тэлеграфе паміж Народным камісарам па справах нацыянальнасцяў РСФСР І. Сталіным і кіраўніком бальшавіцкіх аранізацый Беларусі А. Мясніковым. Яна адбылася 25 снежня 1918 г. У ёй па пачатку І. Сталін паведаміў, што ЦК партыі вырашыў па многіх меркаваннях, пра якія цяпер гаварыць не даводзіцца, пагадзіцца з беларускімі таварышамі на стварэнне Беларускага савецкага ўрада. Пытанне гэта вырашана і абмяркоўваць ужо не даводзіцца.

У гэты час кіраўнікамі РКП(б) і ўрада РСФСР ужо фактычна была выпрацавана пазіцыя аб утварэнні Беларускай рэспублікі на савецкай аснове. Несумненна, што важную ролю ў гэтым адыграла аб'яўленне 25 сакавіка 1918 г. Беларускай Народнай Рэспублікі як незалежнай і вольнай дзяржавы.

Але ўсё ж такі ўзнікае прынцыповае пытанне: што здарылася за першыя тры тыдні снежня 1918 г., ад прыведзенай тэлеграмы У. Леніна — І. Вацэцісу, накіраванай 29 лістапада, і да прыняцця ў пачатку трэцяй дэкады снежня гэтага ж года рашэння ЦК РКП(б) аб стварэнні Беларускага савецкага ўрада? Ва ўнутрыпалітычным жыцці савецкай Расіі і на беларускіх тэрыторыях, якія займала Чырвоная Армія, нічога асаблівага не адбылося.

А за мяжою? А там рабіліся значныя захады, скіраваныя супраць бальшавіцкага праўлення ў Расіі, Беларусі, іншых месцах і яго распаўсюджання на Захад. Коратка адзначым некаторыя з іх у храналагічнай паслядоўнасці.

Па-першае, гэта тое, што адбывалася актыўнае фарміраванне адзінага антысавецкага фронту на беларуска-літоўскіх землях, вялася мабілізацыя заходнееўрапейскай грамадскай думкі ў падтрымку дамагання аднаўленай Польскай дзяржавы ў адносінах да яе ўсходніх суседзяў. Гэтаму садзейнічалі буйныя польскія землеўласнікі, якія знаходзіліся ў кантакце з Польскім нацыянальным камітэтам, што месціўся ў Парыжы. У выніку 6 снежня 1918 г. у Варшаве быў арганізаваны Саюз палякаў беларускіх крэсаў. Быў таксама створаны Камітэт абароны крэсаў. Пры гэтым выказвалася цвёрдае перакананне ў тым, што беларуска-літоўскія землі, якія ўваходзілі ў склад Рэчы Паспалітай да яе падзелаў, павінны быць зноў ёй вернуты.

Па-другое, асігнаўваліся значныя матэрыяльныя і фінансавыя сродкі для рэалізацыі вызначаных палітычных і ваенных мэтаў. 12 снежня 1918 г. польскі ўрад выдзеліў 12 млн марак Камітэту абароны ўсходніх зямель для фарміравання вайсковых часцей з польскага насельніцтва Беларусі і Літвы ў «мэтах супрацьдзеяння бальшавікам». Польскі Генштаб падтрымліваў ідэю стварэння на ўсход ад польскай этнаграфічнай мяжы «скрытых ваенных атрадаў самааховы». Прад'яўляліся прэтэнзіі на беларускія тэрыторыі, занятыя ў канцы 1918 г. Чырвонай Арміяй. У гэтых месцах нават ствараліся польская адміністрацыя. Больш за тое, 21 снежня 1918 г. Ю. Пілсудскі зрабіў паведамленне, што «польскі ўрад прыняў рашэнне акупаваць» гэтыя тэрыторыі. Для гэтай мэты сюды была накіравана літоўска-беларуская дывізія.

Па-трэцяе, гэтыя ваенныя намеры і нават дзеянні аднаўленай Польскай дзяржав

МЕСТНОЕ САМОУПРАВЛЕНИЕ

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

30 снежня 2008 г. № 49 (152)

БЮДЖЭТ

НЕ АБВАСТРАЦЬ СІТУАЦЫЮ, а вучыцца эканоміць

Галоўнай тэмай сесіі Мінскага абласнога Савета дэпутатаў стала абмеркаванне бюджэту вобласці на 2009 год.

З праектам азнаёміў дэпутатаў начальнік фінансавага ўпраўлення Мінаблвыканкама Юрый Шкіруць. У прыватнасці, для спрашчэння падатковай сістэмы праектам бюджэту на 2009 год прадугледжана: зніжэнне стаўкі збору ў рэспубліканскі фонд падтрымкі вытворцаў сельскагаспадарчай прадукцыі, харчавання і аграрнай навукі з 2 да 1 працэнта; устанаўленне адзіных ставак мясцовых падаткаў (падатку з продажу тавараў у рознічным гандлі і мясцовага падатку на паслугі) у памеры 5 працэнтаў; памяншэнне з 5 да 3 працэнтаў памеру стаўкі падатку на набыццё аўтамабільных транспартных сродкаў; пераход да прымянення лінейнай (адзінай) стаўкі падаходнага падатку з фізічных асобаў у памеры 12 працэнтаў, для індывідуальных прадпрымальнікаў — 15 працэнтаў; адмена падатку на даходы ад аперацый з каштоўнымі паперамі і уключэнне такіх даходаў у агульную сістэму абкладання падатку на прыбытак.

Агульная сума бюджэту Мінскай вобласці на наступны год перавысіла 2 трлн 37 млрд рублёў. Памер датацыі з фонду фінансавай падтрымкі складзе 422,6 млрд рублёў.

Праектам бюджэту на ўзроўні абласнога Савета прадугледжана ўвядзенне шэрагу мясцовых падаткаў і збораў. У прыватнасці, збору на ўтрыманне і развіццё інфраструктуры раёна (горада) — у памеры 1 працэнта ад прыбытку прадпрыемстваў, і транспартнага збору — 2 працэнты ад прыбытку. Першы будзе залічвацца ў бюджэты раёна, другі — цэнтралізавацца ў абласным «кашальку». Акрамя таго, будзе ўведзены збор з нарыхтоўшчыкаў (5 працэнтаў ад падатковай базы) і падатак на паслугі (5 працэнтаў выручкі ад рэалізацыі паслуг). Атрыманыя сродкі будуць цалкам залічвацца ў бюджэты раёна (горада Жодзіна), за выключэннем падатку на паслугі сотавай сувязі. Таксама ў раённы бюджэт будуць паступаць збор з карыстальнікаў транспартных сродкаў (за паркоўку, стаянку) і збор за валоданне сабакамі.

У 2009 годзе мясцовыя Саветы дэпутатаў маюць права павялічваць ці памяншаць (але не больш чым у два разы) стаўкі зямельнага падатку, падатку на нерухомасць асобным катэгорыям плацельшчыкаў; даваць асобным плацельшчыкам (фізічным асобам, якія не з'яўляюцца індывідуальнымі прадпрымальнікамі) льготы па выплаце зямельнага падатку, падатку на нерухомасць, падаходнага падатку з фізічных асобаў, адзінага падатку з індывідуальных прадпрымальнікаў і іншых фізічных асобаў, а таксама вызваляць ад выплаты зямельнага падатку і падатку на нерухомасць арганізацыі спажывецкай кааперацыі па аб'ектах гандлю і грамадскага харчавання, размешчаных у сельскай мясцовасці.

У 2009 годзе захаваецца сацыяльная скіраванасць абласнога бюджэту. Выдаткі на фінансаванне галін сацыяльнай сферы і мерапрыемстваў па сацыяльнай абароне насельніцтва складуць 61,9 працэнта бюджэтных адлічэнняў. На ахову здароўя прадугледжана 719 млрд рублёў, што на 29,3 працэнта вышэй за ўзровень гэтага года, на адукацыю — 1124 млрд (на 33 працэнты больш за сёлетнія паказчыкі), на сацыяльную палітыку 220,6 млрд (на 33 працэнты больш). На фінансаванне арганізацый жыллёва-камунальнай гаспадаркі прадугледжана 387 млрд рублёў, з іх на добраўпарадкаванне населеных пунктаў — 69,4 млрд (што амаль удвая менш, чым у 2008-м). Прычым, з гэтых сродкаў 19 млрд пойдуць на аплату вулічнага асвятлення, 20,4 млрд — на бягучы рамонт і ўтрыманне вулічна-дарожнай сеткі. На знос старых дамоў у абласным бюджэце закладзены 3,6 млрд рублёў, на замену цепласетак — 32,4 млрд.

Паводле слоў старшыні Мінскага абласнога выканаўчага камітэта Леаніда Крупца, які таксама браў удзел у правядзенні сесіі, сёлета вобласць спрацавала «ў плюс». Аб'ём даходаў да ўзроўню 2007-га года ўзрос у 1,5 раза і сёлета перавысіў планавыя паказчыкі, аднак цяпер трэба зрабіць захады, каб сродкі, якія маюцца ў наяўнасці, рэалізаваць з максімальнай карысцю. З улікам сусветнага фінансавага крызісу неабходна развіваць разумны, гаспадарчы падыход да распараджэння сродкамі. Пры гэтым старшыня Мінаблвыканкама падкрэсліў, што кіраўніцкаму апарату на ўсіх узроўнях трэба не абвастраць сітуацыю, а карэктна праводзіць ідэалагічную работу з насельніцтвам. Вынікі агульнай працы будуць залежаць ад таго, як кожны будзе працаваць на сваім месцы.

Інга МІНДАЛЁВА.

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

«УЛАДУ АТРЫМЛІВАЮЦЬ. АЎТАРЫТЭТ — ЗАВАЁЎВАЮЦЬ»

На пытанні «МС» адказвае старшыня Мінскага абласнога Савета дэпутатаў, член Савета па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання Святлана ГЕРАСІМОВІЧ

— У канцы года, Святлана Міхайлаўна, прынята падводзіць вынікі. На якія праблемы сёлета была звернутая ўвага дэпутатаў абласнога Савета?

— Нагадаю, што ў гэтым скліканні наш дэпутацкі корпус працуе другі год. Спачатку вызначалі накірункі, апрабоўвалі новыя ідэі... Сёлета зрабілі акцэнт на работе ў рэгіёнах — непасрэдна на месцах праводзілі не толькі прыёмы і сходы, але і выязныя сесіі, і пасяджэнні прэзідыума і камісій аблсавета. Думаю, не памыліліся, аддаўшы перавагу менавіта такой форме работы. Гэта дало магчымасць не толькі ўбачыць кожную праблему «ў тэорыі», але і «дакрануцца» да яе на практыцы, пачуць меркаванні дэпутатаў мясцовай улады і старэйшын. Добра, што не засталіся ў баку ад праблем тэрыторый і кіраўнікі мясцовых прадпрыемстваў і гаспадарак — тым больш, што многія з іх з'яўляюцца дэпутатамі Саветаў розных узроўняў, ад сельскага да абласнога.

Практыку правядзення выязных сесій аблсавета мы будзем працягваць і далей, гэтак жа, як і адзіных дзён дэпутата. Апошняя форма работы таксама аказалася ўдалай, сёння, наколькі мне вядома, ее выкарыстоўваюць не толькі ў Мінскай вобласці, але і ў іншых. Сутнасць вы ведаеце: збіраюцца дэпутаты таго ці іншага ўзроўню, робяць справаздачу аб сваёй рабоце, выязджаюць на прадпрыемствы, выходзяць да людзей на сваім выбарчым участку, наведваюць няўдалыя сем'і...

Але асноўная задача дэпутата — дабівацца таго, каб заканадаўчыя акты, якія прымаюцца на ўзроўні дзяржавы, працавалі і на даверанай яму тэрыторыі. Адпаведна, на сесіях аблсавета і пасяджэннях камісій мы разглядалі ход рэалізацыі розных дзяржаўных праграм у прымяненні да нашай вобласці. Скажам, не ўсё так гладка, як хацелася б, атрымліваецца з практычным бокам праграмы адраджэння і развіцця вёскі. Зроблена, безумоўна, шмат. Але калі паглядзець дэталёва — узнікаюць пытанні і з якасцю будаўніцтва дамоў для вяскоўцаў, і з навадзненнем парадку ў аддаленых, невялічкіх населеных пунктах, якія трэба абуладкоўваць свайміі сіламі... Хіба могуць не датычыцца дэпутата гэтыя моманты?

Нядаўна на сесіі абласнога Савета разглядалі пытанні дэмаграфічнай бяспекі і, зразумела, выкананне адпаведнай дзяржаўнай праграмы. На жаль, узровень нараджальнасці і ўзровень смяротнасці ў вобласці не даюць падстаў для заспакаення. Хоць, напэўна, ні ў якія іншыя часы дзяржава не давала сваім грамадзянам столькі льгот — у сэнсе падтрымкі сям'і. Задача дэпутата — растлумачыць гэтыя перавагі, данесці да людзей. Што і робім.

А вазьміце праграму «Чыстая вада» — увогуле вечная тэма! У адпаведнасці з Указам № 21 мы правялі інвентарызацыю ўсіх сістэм водазабеспячэння і калодзежаў. Сістэмы, на жаль, не вечныя — яны прыходзяць у заняпад, узровень вады з цягам часу зніжаецца... Сёння нам неабходна думаць пра закупку сучаснай тэхнікі для ўчасткаў ЖКГ. Гэту праблему мы неаднойчы абмяркоўвалі і з губернатарам вобласці — ён таксама выступае за стварэнне ў кожным раёне брыгад, аснашчаных усёй неабходнай тэхнікай. Каб яны маглі выехаць у кожны сельсавет і зрабіць усё, што патрабуецца.

— Дэпутаты маюць права ўносіць прапановы і па ўдасканаленні заканадаўства...

— Безумоўна, мы выкарыстоўваем гэту магчымасць. Наш дэпутацкі корпус непакоіць, напрыклад, стан работы з сям'ёй. Здавалася б, сёння ў гэтым накірунку многае робіцца, існуе пэўная заканадаўчая база — закон аб правах дзіцяці, дэкрэт № 18... Але, на мой погляд, нам не хапае заканадаўчага дакумента аб адказнасці бацькоў за выхаванне сваіх дзяцей — пачынаючы нават не з моманту іх нараджэння, а з таго моманту, як утварылася сям'я... Калі я пачала ўшчыльную займацца гэтым пытаннем, то прыйшла да высновы, што, па сутнасці, сёння ні мама, ні тата не нясуць вялікай адказнасці перад грамадствам за выхаванне паўнавартаснага чалавека.

(Заканчэнне на 2-й стар. «МС».)

ПЕРШАЕ ІНТЭРВ'Ю НА НОВАЙ ПАСАДЗЕ

АДЛАДЖАНАЯ СІСТЭМА

Да беларускага ноу-хау ў кіраванні на месцах прыглядаюцца расіяне

Увага да праблем на месцах з-за іх уяўнай нязначнасці часам засланяецца работай над глабальнымі стратэгічнымі задачамі. Але, выратоўваючы свет, можна не разгледзець таго, што адбываецца, можна сказаць, пад носам. Мясцовыя праблемы да людзей бліжэйшыя за ўсе астатнія, а значыць — больш адчувальныя.

На наступныя чатыры гады за пытанні мясцовага самакіравання ў ніжняй палаце беларускага парламента адказвае наш сённяшні суразмоўца. Знаёмцеся — *Васіль БАЙКОЎ, старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па дзяржаўным будаўніцтве, мясцовым самакіраванні і рэгламенце*. У мінулым — старшыня Віцебскага абласнога камітэта прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя. Так што «навічок» у парламенце зусім не новы чалавек у сістэме кіравання і з праблемамі рэгіёнаў знаёмы не па чутках.

— Васіль Міхайлавіч, як развіваецца заканадаўства ў сферы мясцовага самакіравання?

— 12 снежня Палатай прадстаўнікоў прыняты ў першым чытанні папраўкі ў закон аб статусе дэпутата мясцовага Савета дэпутатаў. Законапраект быў унесены Саветам Міністраў Беларусі. Новаўвядзенні прадугледжваюць замацаваць права на кампенсацыю камандзіровачных выдаткаў, звязаных з дэпутацкай дзейнасцю, не толькі ў дачыненні да дэпутатаў, якія працуюць на падставе працоўнага дагавора, але і дэпутатаў, якія не працуюць на падставе працоўнага дагавора (пенсіянеры, індывідуальныя прадпрымальнікі, беспрацоўныя і іншыя). Прадугледжаныя кампенсацыйныя выплаты будуць здзяйсняцца адпаведным выканкамам за кошт сродкаў мясцовага бюджэту ў парадку, які вызначаецца Саветам дэпутатаў. Праектам таксама прадугледжваецца ўнесці адпаведныя змяненні і дапаўненні ў дзейны закон, каб прывесці яго ў адпаведнасць з прынятымі актамі, у прыватнасці, з Указам кіраўніка дзяржавы «Аб дадатковых мерах па рабоце са зваротамі грамадзян і юрыдычных асобаў». Ужо вызначаны план падрыхтоўкі законапраектаў на 2009 год. Улічваючы крызіс, асабліва актуальным з'яўляецца эканамічны блок — ён у прыватнасці, прадугледжвае лібералізацыю эканомікі. Што датычыцца заканатворчасці ў дачыненні да рэгіёнаў, то мы не бачым пакуль гэту частку законаў у плане работы на 2009 год.

— Аднак гэта, відаць, не азначае, што вы як дэпутат не бачыце тут патрэбы ўплываць на сітуацыю?

— Безумоўна. Да прыкладу, адна з такіх складаных праблем, асабліва ў аддаленых населеных пунктах, — гэта, як ні дзіўна, праблема водазабеспячэння. Па шэрагу акруг Віцебскай, Гродзенскай абласцей (я кантактую з іншымі дэпутатамі) у асобных населеных пунктах праблема водазабеспячэння ёсць. Мяркуем, што будзем недзе падштурхоўваць гэта пытанне. Кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Уладзімір Макей даў даручэнне перагледзець шэраг дзяржаўных праграм. І ў тым ліку, напэўна, будзем пераглядаць і дзяржпраграму «Чыстая вада», каб на нейкім этапе вярнуцца менавіта да арганізацыі водазабеспячэння ў кожным населеным пункце. Яшчэ з савецкіх часоў, відаць, засталася гэта праблема, якая хвалюе многіх жыхароў. Мы сёння ўжо не гаворым аб праблеме арганізацыі забеспячэння прадуктамі харчавання — яна ў краіне вырашана. Менш праблем стаіць сёння, да прыкладу, у сферы арганізацыі медыцынскага абслугоўвання. Аднак ёсць праблемы па транспартным забеспячэнні.

— А як бачыце сваю работу ў рэгіёне на найбліжэйшую перспектыву?

— Заканчваецца год, ідуць справаздачы выканаўчай улады. Я буду ўдзельнічаць у сесіях раённага Савета ў Шумілінскім раёне, буду весці прыём грамадзян у Віцебскім раёне — гэта мая акруга. І галоўная задача сёння, што б там ні казалі, — гэта выкананне ўсіх параметраў сацыяльна-эканамічнага развіцця, таму што на гэтым базіруецца і магчымасць папаўнення бюджэту, і тое, як мы пачнём 2009 год. Галоўнае сёння — завяршыць год дастойна, каб нас мінімальна закранулі праблемы агульнага крызісу. Да прыкладу, у маёй акрузе ёсць Обальскі керамічны завод, які займаецца вытворчасцю цэглы. І да крызісу практычна 60 працэнтаў яго рэалізоўвалася ў Расіі — Калінінград, Мурманск, Санкт-Пецярбург. Сёння рэалізацыя спынілася практычна поўнасцю. Мы ведаем, што ў Расіі будоўлі «замарожаны» на 90 працэнтаў. І тут праблема — як быць калектыву, якое рашэнне прыняць? У першую чаргу неабходна зарыентавацца на максімальную рэалізацыю на ўнутраным рынку, ну а па-другое, шукаць новыя рынкі.

— Ці будзеце вы садзейнічаць прадпрыемству ў рашэнні гэтай праблемы?

— Вядома ж! Не толькі буду — мы ўжо прагаварылі асобныя моманты. Таму што менавіта забеспячэнне параметраў у будаўнічай сферы паводле прагнозаў 2008 года ў рэспубліцы павінна быць выканана — мы бачым гэта са справаздачаў ураду. Натуральна, больш трэба выкарыстоўваць менавіта мясцовыя віды будаўнічых матэрыялаў, каб «замкнуць» рэалізацыю на ўнутраным рынку.

Дарэчы, дэпутат узнімаў гэта пытанне і ў Авальнай зале падчас сумеснага пасяджэння парламентарыяў абедзвюх палат і ўрада. Віцэ-прэм'ер Віктар Бура запэўніў, што ва ўрадзе разглядаюць індывідуальнае жыллёвае будаўніцтва як адзін з істотных элементаў магчымага нарошчвання аб'ёмаў выкарыстання мясцовых будаўнічых матэрыялаў.

Так што, нягледзячы на наяўнасць праблемаў на мясцовым узроўні, іх вырашэнню ўсё ж надаецца належная ўвага.

(Заканчэнне на 2-й стар. «МС».)

ЗАЛАТЫЯ ПРАВІЛЫ ПАСПЯХОВАГА ГАНДЛЮ

АД «УНІВЕРМАГА «СЛУЦК»

Напярэдадні Новага года быць пакупніком асабліва прыемна. Звычайны візіт у краму ператвараецца ў сапраўдную экскурсію па гандлёвых залах, дзе кожны аддзел, кожная вітрына цешыць вока сваім мастацкім калядна-навагоднім афармленнем і святочнымі зніжкамі на тавары... Прынята лічыць, што самыя распешчаныя пакупнікі — у плане разнастайнасці асартыменту і багацця праводзімых акцый — жыхары сталіцы і абласных цэнтраў. А крыху глыбей, у правінцыі, гандаль вылучаецца спартанскім мінімалізмам (сціплым асартыментам, які на дзевяць дзясятых складаецца з тавараў паўсядзённага карыстання і можа быць аднесены да прадукцыі эканом-класа). Аднак дастаткова завітаць ва ўнівермаг «Слуцк», размешчаны ў аднайменным горадзе, каб зразумець, наколькі састарэлае і далёкае ад праўды гэтае меркаванне.

Загадчыца секцыі дзіцячых цацак Алена ВАЛЕТКА.

Па памерах гандлёвых плошчаў «Слуцк» параўнальны са сталічным «Кірмашом» і не саступае свайму мінскаму калегу ні ў багацці асартыменту, ні ў колькасці перадсвяточных акцый і зніжак. «Мы ў сваёй рабоце ніколі не выходзілі з меркавання, што калі мы — правінцыя, значыць увесь наш асартымент павінен складацца выключна з танных тавараў паўсядзённага попыту, — адзначыла дырэктар КУП «Універмаг «Слуцк» Наталля БЛАХІНА. — Танная прадукцыя ў нас, безумоўна, ёсць, аднак прадаюцца і эксклюзіўныя, дарагія тавары сусветнавядомых вытворцаў. Напрыклад, у аддзеле касметыкі побач з айчыннымі фірмамі вы знойдзеце і знакамітыя брэнды. У ювелірным аддзеле ёсць і недарагія залатыя пярсцёнкі, і шыкоўныя масіўныя мадэлі, аздобленыя каштоўнымі камянямі. Наш асартыменты пералік складзены такім чынам, каб задаволіць патрэбы пакупнікоў з самым розным узроўнем даходаў».

Паводле слоў дырэктара, за апошнія гады значна ўзрос дабрабыт яе землякоў, што станоўча адбілася на іх пакупніцкай здольнасці. Павялічыўся попыт на культтавары і складаную бытавую тэхніку. Больш сталі набываць халадзільнікаў, пральных машын, газавых пліт — у асноўным беларускай вытворчасці. Продаж мэблі вырас настолькі, што дырэкцыя ўнівермага палічыла мэтазгодным адкрыць асобны спецыялізаваны салон, дзе быў бы шырокі выбар прадукцыі айчынных вытворцаў. Салон адкрыўся ў лістападзе гэтага года. Выбар тут і сапраўды шыкоўны. Сюды варта зазірнуць хоць бы для таго, каб пазвіцца на цудоўны дызайн гандлёвай залы і на свае вочы ўбачыць, на якія выдатныя (і недарагія!) рашэнні здольныя беларускія вытворцы мэблі.

«Сёння па многіх пазіцыях беларускія тавары не саступаюць імпартным, — патлумачыла Наталля Віктараўна. — За апошнія гады колькасць і якасць айчыннай прадукцыі ўзраслі ў разы. І гэта датычыцца не толькі мэблі. У агульным тавараззвароце ўнівермага значна павялічылася доля тавараў дробных прыватных прадпрыемстваў. Напрыклад, асабліва папулярнасцю ў нашых пакупніц карыстаюцца касцюмы і святочныя ўборы брэсцкіх прыватных швейных фірмаў. Іх мадэлі заўсёды вылучаюцца якасцю і модным дызайнам».

Пасля адкрыцця спецыялізаванага салона на вызваленых ад мэблі плошчах універмага была пашырана секцыя спартыўных тавараў, адкрыта новая секцыя скураной галантарэі. «Прага да здаровага ладу жыцця і захапленне спортам год ад году набываюць усё большую папулярнасць, — пацвердзіла Наталля Блахіна. — Асабліва актыўна ідзе продаж спартінвентару па безнаяўным разліку».

Залатое правіла гандлю «попыт нараджае прапанову» працуе і ў адваротным парадку: дайце пакупніку больш багаты выбар і ён зробіць больш пакупак. Дзейснасць гэтай формулы ўласным прыкладам пацвярджае не толькі секцыя спорттавараў, але і ўсе аддзелы ўнівермага. Яшчэ адзін пастулат паспяховага гандлю сцвярджае, што пераход крамы (аддзела) на сістэму самаабслугоўвання прыносіць павелічэнне тавараззвароту на 30-40 працэнтаў. Менавіта таму амаль усе секцыі ўнівермага «Слуцк» — за выключэннем парфумернай і ювелірнай — працуюць паводле прынцыпу самаабслугоўвання. Такі спосаб гандлю зручны для пакупнікоў і выгадны для крамы.

Да калядна-навагодніх святаў універмаг «Слуцк» пачаў рыхтавацца за некалькі месяцаў. Павялічыў запасы зімовага асартыменту, колькасць сувеніраў, жаночай бялізны. Дамовіўся з айчыннымі вытворцамі аб правядзенні святочных акцый, дэгустацый, аб прадастаўленні зніжак і ўцэнак.Толькі ў снежні дэгустацыі сваёй прадукцыі правялі 7 прадпрыемстваў, у тым ліку Слуцкі мясакамбінат, Салігорскі ГМЗ, Гродзенская кампанія «АВС», «Белрыба». Дзясяткі вытворцаў зрабілі зніжкі на свае тавары: магілёўская «Веснянка» — у памеры 30 працэнтаў, Мінскі гадзіннікавы завод — у памеры 15 працэнтаў, пінскае ААТ «Палессе» — 20-60 працэнтаў, абутковыя вытворцы «Марко» і «Белькельме» — у памеры 10 працэнтаў. Акрамя таго, шэраг прадпрыемстваў пры набыцці іх прадукцыі радаваў спажыўцоў падарункамі — цацкамі, сувенірамі, прадметамі інтэр'ера.

Асобнай увагі заслугоўвае афармленне гандлёвых залаў. Дзякуючы намаганням калектыву і дызайнераў, вітрыны і інтэр'ерныя кампазіцыі — з манекенамі, цацкамі, кветкамі, ёлкамі, бантамі — атрымалі незвычайнае вырашэнне і напоўнілі ўнівермаг атмасферай свята і казкі. Мастацкаму аздабленню пазайздросцяць многія абласныя і нават сталічныя крамы.

Сёння ўнівермаг «Слуцк» — гэта не толькі прамтавары, а яшчэ 4 харчовыя крамы, 2 крамы мэблі, адна камісійная, кавярня «Беларускае бістро», цырульня. Прадпрыемства чатыры разы было занесена на рэспубліканскую Дошку гонару, мае «Бронзавага Меркурыя» (найвышэйшую ўзнагароду Міністэрства гандлю), шэраг іншых узнагарод і дыпломаў.

Матэрыял падрыхтавалі Інга МІНДАЛЁВА, Вераніка ХІЛЬКЕВІЧ. Фота Марыі ЖЫЛІНСКАЙ.

УНП 600154568

ПАВАЖАНЫЯ СЯБРЫ!

Вялікі калектыў КУП «Мінскхлебпрам» віншуе вас са светлымі святамі — Новым годам і Калядамі! Зычым моцнага здароўя, бадзёрасці і аптымізму, дабрабыту і міру ў кожную хату! І смачнага свежага хлеба! Бо не дарма кажуць, што хлеб — галоўны прадукт на стале беларуса.

КУП «Мінскхлебпрам» аб'ядноўвае сем хлебазаводаў сталіцы. Яны маюць разнастайны асартымент прадукцыі, якая неаднаразова была адзначана на многіх міжнародных і рэспубліканскіх конкурсах. Да святаў мы падрыхтавалі шмат смачных падарункаў. Запрашаем у гандлёвыя пункты сталіцы!

КУП «Мінскхлебпрам»
г. Мінск, вул. Віцебская, 17,
тэл. 8 017 203 10 61,
факс 8 017 203 63 18.

УНП 100056428

Мы помогаем услышать жизнь!

-Современные цифровые слуховые аппараты, внутриушные слуховые аппараты.
-Квалифицированное медицинское обследование.
-Индивидуальный подход к каждому клиенту.
-Изготовление индивидуальных ушных вкладышей по современным технологиям.
-Гарантийное и сервисное обслуживание.

г. Минск, ул. Плеханова, д.27
т.(017)296 46 70, 295 69 77
Лиц. 02040/0239600 выдана Мингорисполкомом от 22 мая 2008г.

Віншуем з надыходзячым Новым 2009 годам і Нараджэннем Хрыстовым!

КЕРАМЗИТ Новолукомль Novolukoml KERAMZIT

ОАО «ЗАВОД КЕРАМЗИТОВОГО ГРАВИЯ г. НОВОЛУКОМЛЬ»

Керамзит – тепло- и звукоизоляционный материал
Коэффициент теплопроводности 0,10 – 0,11 Вт/м°С
Керамзитобетонные блоки «ТермоКомфорт» - новый стеновой материал XXI века
Коэффициент теплопроводности 0,139 Вт/м°С
Продукция сертифицирована, имеет СЕ-маркировку

Крупское шоссе, 1, 211162, г. Новолукомль, Чашникский район, Витебская область, Республика Беларусь

ISO 9001:2000
ISO 14001:2004
OHSAS 18001:1999

УНП 300019998

Наша продукция комфортна, экологична и долговечна!

Тел./факс: (02133) 36031, 36611, 35308, 37347
www.keramzit.by e-mail: info@keramzit.by

«УЛАДУ АТРЫМЛІВАЮЦЬ...»

(Заканчэнне.
Пачатак на 1-й стар. «МС».)

Дэкрэт № 18 — своечасовы і патрэбны дакумент, але з яго дапамогай мы змагаемся не з прычынай, а з наступствамі... Сёння часта ўзнікаюць сітуацыі, калі доктар у паліклініцы ўгаворвае цяжарную жанчыну легчы ў бальніцу для захавання цяжарнасці, а яна... увогуле знікае, не з'яўляецца на абследаванні. І ніхто не можа на яе паўплываць. А потым дзіця нараджаецца з паталогіяй — у лепшым выпадку. Вельмі балючая тэма, я ёю сёння «хварэю». Тут увогуле не павінна быць абыякавых, бо ўсё пачынаецца з сям'і.

На апошняй сесіі абласнога Савета мы прынялі рашэнне: распрацаваць адпаведныя прапановы па гэтым пытанні і вынесці іх на разгляд Савета па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання.

— На працягу года ў рамках работы Савета па ўзаемадзеянні, членам якога вы таксама з'яўляецеся, неаднаразова абмяркоўвалася пытанне фарміравання бюджэтаў першаснага ўзроўню — сельсаветаў і пассаветаў. Размова ішла аб зніжэнні ўзроўню датацый. Напэўна, гэта тэма актуальная і для Мінскай вобласці?

— Думаю, з цягам часу мы прыйдзем да таго, што датацыі, якія выдзяляюцца большасці сельсаветаў з вышэйшых бюджэтаў, будуць складаць толькі 30 працэнтаў, а 70 працэнтаў неабходных сродкаў яны заробяць самі. У нас ужо сёння ёсць сельсаветы, якія на 80 працэнтаў забяспечваюць свой бюджэт — у Мінскім раёне, у Лагойскім, у Смалявіцкім, Дзяржынскім, Вілейскім і іншых. Там здаюць у арэнду і прадаюць на аўкцыёнах зямлю і будынкі. Дзякуючы адным толькі аўкцыёнам па продажы зямельных участкаў сёлета сельскія Саветы вобласці зарабілі 45 мільярдаў 250 мільёнаў рублёў, і ўсе грошы засталіся ў іх. Што цікава — на пачатку года па ўзроўні даходаў ад правядзення аўкцыёнаў лідзіраваў Мінскі раён, астатнія прыглядаліся. Цяпер ёсць заробкі ў кожным раёне. Напрыклад, у Салігорскім дзякуючы аўкцыёнам у бюджэты сельсаветаў паступіла 585 мільёнаў рублёў, у Барысаўскім — 626 мільёнаў, у Дзяржынскім — больш за 2,5 мільярда... Гэтыя грошы ідуць на добраўпарадкаванне тэрыторыі і падрыхтоўку да аўкцыёну іншых зямельных участкаў... А прадаваць ёсць што ўсім, паверце. Проста некаторыя кіраўнікі першаснага звяна па-ранейшаму разварушваюцца. А трэба наладжваць сувязі, прыцягваць пакупнікоў, імкнуцца іх зацікавіць, даваць рэкламу праз прэсу... Работа па падрыхтоўцы ўчасткаў да продажу карпатлівая, магчыма, нават руцінная. Але за год можна дабіцца пэўных зрухаў.

— Тыповая сітуацыя — калі старшыня сельскага Савета, валодаючы зароблены ад аўкцыёну мільёнамі, не можа патраціць іх на вырашэнне надзённага пытання менавіта таму, што такія траты не «прапісаныя» ў законе.

— Так, вы маеце рацыю, праблема сапраўды існуе. І я збіраюся таксама ўнесці прапанову аб тым, што неабходна пашырыць магчымасці старшыні сельскага Савета ў плане выкарыстання зароблены на аўкцыёне сродкаў. Як гаспадар на сваёй тэрыторыі, ён павінен мець права накіроўваць гэтыя грошы на вырашэнне тых пытанняў, якія маюць першараднае значэнне.

Можна пакідаць у бюджэтах сельсаветаў і частку падаходнага падатку — скажам, у тых раёнах, дзе сельсаветы маюць прыкладна аднолькавы ўзровень сацыяльна-эканамічнага развіцця. Але спецыфіка Мінскай вобласці такая, што многія буйныя прадпрыемствы размешчаны не ў раённым цэнтры, а менавіта на тэрыторыі сельсаветаў. (Той жа Гарадзейскі цукровы завод.) І калі мы пакінем нават частку падаходнага падатку сельсавету — атрымаецца яўны перакос на карысць дадзенага бюджэту. Ды і раён застанецца без неабходных сродкаў. Так што да фарміравання пярвічных бюджэтаў мы падыходзім вельмі індывідуальна, па кожным сельсавеце ён распрацоўваецца асобна. З гэтага года ў першасныя бюджэты часткова залічваецца падатак з продажу. Але тут таксама неабходны разумныя падыходы на ўзроўні райвыканкамаў: трэба дапамагчы фінансамі не толькі сельскаму Савету, але і Дому культуры, і ўчастковай бальніцы, і школе. Бюджэт — справа вельмі тонкая, тут нельга стрыгчы ўсіх пад адзін грэбень.

А ўвогуле стараемся падыходзіць да фінансавання так, каб пазбегнуць непатрэбных выдаткаў — і на транспарт, і на рамонт асабістых кабінетаў. Хоць многія будынкі сельскіх Саветаў мы адрамантавалі і спыняць гэту работу не збіраемся.

— За апошнія некалькі гадоў многія населеныя пункты Мінскай вобласці сталі выглядаць па-іншаму — няма адчування заняпаду, закінутасці, а многія аб'екты і пабудовы проста радуюць вока... Вы пагодзіцеся з тым, што чым больш грошай у бюджэце сельсавета, тым лепш ён добраўпарадкаваны?

— Не, не зусім. Многае залежыць ад самога кіраўніка Савета і «каманды», якая за ім стаіць, ад іх жадання працаваць. Возьмем, напрыклад, Старадарожскі раён, дзе райсавет узначальвае Сцяпан Уладзіміравіч Чачуха. У іх там што, грошай многа? Але ўсе будынкі сельскіх Саветаў выглядаюць на ўзроўні, усюды зроблены належны рамонт. Яны паставілі задачу, прадумалі, як можна яе вырашыць, і дабіліся свайго. І галоўнае — абышліся без вялікіх затрат.

Зразумела, некаторыя праблемы самому сельсавету, без дапамогі раёна, вобласці, вырашыць цяжка. Маю на ўвазе знос старых і пустых будынкаў. Мы ўшчыльную займаемся гэтым пытаннем і толькі за апошні год знеслі каля 4000 такіх дамоў. Лічба атрымалася такой вялікай, таму што з абласнога бюджэту на вырашэнне праблемы было выдзелена 2,5 мільярда рублёў. Першую частку — 1,5 мільярда — мы размеркавалі па раёнах раўнамерна. Паглядзелі, хто і як гэту работу вядзе, якімі тэмпамі, якія сумы затрачваюцца... Атрымалася, што ў адным сельсавеце затрачваюць на знос дома 300 тысяч рублёў, у другім — 600 тысяч, а ў трэцім — 1 мільён і больш... Кожны пайшоў сваім шляхам. Тым раёнам, якія першымі асвоілі сродкі — ды яшчэ і з толкам, з розумам, з невялікімі затратамі на знос кожнага будынка, — мы выдзелілі дадатковыя грошы. Сёння ў Валожынскім раёне знесена 324 дамы, у Любанскім — 446, у Мядзельскім — 652, у Клецкім — 319...

— А колькі яшчэ засталося?

— 5,5 тысячы на тэрыторыі вобласці... Я таксама спачатку думала, што за год знясём усю старызну падчыстую. Але адны зносім — а іншыя паралельна прыходзяць у заняпад: людзі ад'язджаюць, паміраюць... Калі будзем працаваць, не зніжаючы інтэнсіўнасці, праблема вырашыцца хутка. Праўда, далей пойдзем не па шляху павелічэння сродкаў, якія дзяржава выдзяляе на знос старых дамоў, а па шляху патаннення затрат. Увогуле ставім перад сабой мэту не проста зносіць дамы — на іх месцы трэба па магчымасці будаваць новыя, уключаць у сельгасабарот пустыя ўчасткі. Як гэта робіцца ў Грыцкавіцкім сельсавеце Нясвіжскага раёна, дзе кожны кавалачак зямлі апрацаваны і даведзены да ладу. Яны зносяць старыя хаты, але фундаменты пакідаюць — на гэтых месцах сельгаспрадпрыемства па прэзідэнцкай праграме будуе новыя дамы. Пры гэтым захоўваецца сама вёска...

Увогуле, яшчэ восенню пры кожным раённым Савеце мы стварылі камісію, якая павінна абследаваць усе населеныя пункты: паглядзець, ці ёсць там зямля, якая не апрацоўваецца належным чынам. І, калі трэба, вынесці занядбаныя ўчасткі ў палі агульнага севазвароту. Або ўвогуле вярнуць іх гаспадаркам... Такая пазіцыя мясцовай улады прымусіла спадчыннікаў, у якіх гадамі да ўчасткаў не даходзілі рукі, актывізавацца.

— І зноў, Святлана Міхайлаўна, мы вяртаемся да пытання аўтарытэту мясцовай улады...

— Мясцовая ўлада павінна паставіць сябе так, каб людзі паважалі яе і лічыліся з ёю. Тады і будуць вынікі. Да вырашэння кожнага пытання трэба падыходзіць па-дзяржаўнаму, з пункту погляду інтарэсаў дзяржавы... Большасць праблемаў сёння можна вырашыць на месцах, ва ўсякім разе, на ўзроўні раёна — і не трэба для гэтага нікуды ісці, шукаць падтрымкі «наверсе». Ёсць бюджэт сельсавета, бюджэт раёна, дадзена магчымасць зарабіць — калі ласка, напружвайцеся, праяўляйце ініцыятыву, паварушчвайцеся.

Ведаеце, за два гады мы замянілі каля 10 працэнтаў старшыняў сельскіх Саветаў. Хоць і падбор быў нядрэнны, і людзі дастойныя. Але не атрымалася ў іх стаць гаспадарамі на сваёй тэрыторыі. А тэрыторыю трэба бачыць — у развіцці, у перспектыве, глабальна. І хоць бы прыблізна ведаць, якой яна павінна быць праз тры гады, праз пяць ці праз дзесяць... Думаю, таму складу кіраўнікоў мясцовай улады і дэпутатаў, з якім мы працуем сёння, гэта па сілах.

Наталля КАРПЕНКА.

ПЕРАВЯРНУЦЬ ЧЫНОЎНІЦКУЮ ПІРАМІДУ

Напрыканцы года ў Інстытуце вышэйшых кіраўніцкіх кадраў Акадэміі кіравання адбыўся чарговы «круглы стол» па абмеркаванні праблемаў рэалізацыі Указа Прэзідэнта № 21. Удзел у сустрэчы, акрамя старшыняў сельскіх і пасялковых Саветаў дэпутатаў, прынялі адказны сакратар Савета па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання пры Савеце Рэспублікі Аляксей Сцепаненка і начальнік галоўнага ўпраўлення бюджэтнай палітыкі Міністэрства фінансаў Максім Ермаловіч.

Аляксей Сцепаненка расказаў аб рабоце Савета па ўзаемадзеянні за гэты год. Паводле яго слоў, на працягу апошніх 2-3 месяцаў Савет рабіў упор на ўпарадкаванне справаводства сельсаветаў і сельвыканкамаў, на аптымізацыю ўсіх формаў справаздачнасці і скарачэнне адміністрацыйных працэдур.

Што датычыцца ўпарадкавання справаводства, на мінулым тыдні гэта работа была завершана. Дэпартамент па архівах і справаводстве разам з усімі зацікаўленымі міністэрствамі і ведамствамі на аснове наяўнай заканадаўчай базы распрацаваў і зацвердзіў прыкладную наменклатуру спраў для першаснага ўзроўню. Аб'ём спраў для сельвыканкама скараціўся на 44 працэнты ад ранейшага, а для Савета — на 50 працэнтаў. Новая прыблізная наменклатура прадугледжвае 121 справу для сельвыканкама і 7 — для Савета. Але гэта не значыць, што ўсім Саветам трэба строга яе прытрымлівацца, адзначыў Аляксей Сцепаненка. Наменклатура была распрацавана для сярэднестатыстычнага сельсавета, з прыблізнай колькасцю насельніцтва каля 2 тыс чалавек. Пры творчым падыходзе — з улікам спецыфікі канкрэтнай тэрыторыі, яе праблемаў і структуры, — колькасць спраў для сельвыканкама можна скараціць нават да 70-80. Агульнымі намаганнямі атрымалася скараціць 7 відаў статыстычнай справаздачнасці. А вось з ведамаснай справаздачнасцю выйшла замінка. «Не пазней за канец першага квартала новага года ўсе абласныя, раённыя і сельскія Саветы павінны вярнуцца да гэтага пытання і разгледзець ход выканання Дырэктывы Прэзідэнта № 2 аб мерах па дэбюракратызацыі дзяржаўнага апарата, — заявіў Аляксей Сцепаненка. — Вам трэба запрасіць усе раённыя службы, якія перашкаджаюць працаваць, і адназначна патлумачыць, што па іх віне не выконваецца Дырэктыва. Чыноўніцкую піраміду трэба перавярнуць. Калі ўсе службы пачнуць самі працаваць на месцах, а не дасылаюць вам пісьмовыя даручэнні, у дзяржаве будзе парадак».

Новы Бюджэтны кодэкс абмяжуе правы раёна па цэнтралізацыі даходаў і дасць сельскім Саветам большую ступень свабоды.

У працяг тэмы аптымізацыі Аляксей Сцепаненка паведаміў, што ў Савета па ўзаемадзеянні пакуль не атрымалася ўдасканаліць колькасць адміністрацыйных працэдур. Міністэрства юстыцыі па даручэнні Прэзідэнта зараз рыхтуе змены ў адпаведны ўказ па адміністрацыйных працэдурах. Можна спадзявацца, што ў першым квартале новага года пэўнае скарачэнне адбудзецца і ў гэтым накірунку.

Падчас правядзення аналагічных «круглых сталоў» па абмеркаванні Указа № 21 неаднаразова ўзнімалася пытанне аб слабым бюджэтным напаўненні «чарнобыльскіх» рэгіёнаў. Аляксей Мікалаевіч паведаміў, што ў гэтым плане ёсць пэўныя станоўчыя зрухі. У прыватнасці, для Саветаў першаснага ўзроўню, якія знаходзяцца на забруджанай тэрыторыі, па некалькіх пазіцыях дадаткова павялічыліся адлічэнні. Напрыклад, 77 млрд рублёў, якія вызваліліся з абласных бюджэтаў пасля ўпарадкавання льгот, будуць накіраваны на першасны ўзровень для вырашэння пытанняў водазабеспячэння, утрымання дарог і г.д.

Шмат сілаў Савет па ўзаемадзеянні прыклаў для распрацоўкі змяненняў ва ўказ № 21 — адносна ўключэння падаходнага падатку з фізічных асобаў у пералік даходных крыніц бюджэтаў першаснага ўзроўню. Спачатку працэс ішоў вельмі актыўна, аднак Савет міністраў вярнуў праект на дапрацоўку, бо яго палажэнні не стасуюцца з патрабаваннямі Бюджэтнага кодэкса і закона «Аб бюджэце на 2009 год».

Парадавалі прысутных вынікі работы Савета па ўзаемадзеянні з Міністэрствам камунальнай гаспадаркі па пытанні перадачы на баланс грамадскіх шахтавых калодзежаў. Аляксей Сцепаненка паведаміў, што зараз уносяцца змены ў пералік работ па ўтрыманні аб'ектаў добраўпарадкавання населеных пунктаў, якое праводзіцца за бюджэтныя сродкі — там цяпер будуць фігураваць і работы па ўтрыманні грамадскіх шахтавых калодзежаў. Ужо распрацаваны тэхнічны кодэкс практыкі эксплуатацыі пабудоў і абсталявання крыніц нецэнтралізаванага пітнога водазабеспячэння населеных пунктаў, вызначаны нормы па абслугоўванні калодзежаў і іх рамонце. Мінкамунгас звярнуўся ў абласныя і Мінскі гарадскі выканаўчыя камітэты з прапановай актывізаваць работу па перадачы шахтавых калодзежаў грамадскага карыстання на баланс арганізацый ЖКГ да 1 студзеня 2009 года. Наступным крокам у гэтым накірунку павінна быць перадача на баланс камунальных службаў грамадскіх могілак, паабяцаў Аляксей Сцепаненка.

Максім Ермаловіч абышоўся без уступнага слова і адразу прапанаваў перайсці да абмеркавання праблемаў, якія сёння турбуюць старшыняў сельскіх і пасялковых Саветаў. Прысутныя задалі яму шэраг пытанняў аб асаблівасцях фарміравання бюджэтаў першаснага ўзроўню на наступны год, аб фінансаванні выдаткаў на ўтрыманне і абслугоўванне тэхнічнага інвентару (мотакасілак і інш.), аб рабоце з казначэйствам.

Адказваючы на пытанні, Максім Леанідавіч у прыватнасці адзначыў, што сёння створана і дзейнічае дастаткова эфектыўная, хай і не пазбаўленая пэўных недахопаў, сістэма фінансавання выдаткаў бюджэтаў першаснага ўзроўню. Пачынаючы з 2009 года, фарміраванне бюджэтаў будзе праходзіць у новых умовах: новы Бюджэтны кодэкс абмяжуе правы раёна па цэнтралізацыі даходаў і дасць сельскім Саветам большую ступень свабоды.

Выступоўца нагадаў, што ўказ № 21 скіраваны на тое, каб разгрузіць Саветы ад неўласцівых ім заняткаў. У сельскага Савета павінны застацца толькі функцыі дзяржаўнага органа, а ўсе гаспадарчыя функцыі яму неабходна перадаць спецыялізаваным арганізацыям.

На завяршэнні сустрэчы Максім Леанідавіч заклікаў прысутных выдаткоўваць грошы толькі на сапраўды неабходнае, эканоміць дзяржаўныя сродкі, набываць тавары толькі айчыннай вытворчасці.

Інга МІНДАЛЁВА.

АДЛАДЖАНАЯ СІСТЭМА

(Заканчэнне.
Пачатак на 1-й стар. «МС».)

У мяне быў вялікі вопыт работы ў рэгіёне яшчэ да абрання дэпутатам. Таму я не толькі ведаю праблемы, што існуюць, але і бачу пэўныя хібы ў рабоце мясцовай улады — Саветаў, выканкамаў. Таму, натуральна, праз выезды, арганізацыю прыёму грамадзян на месцах буду ўплываць на сітуацыю, каб закрываць гэтыя моманты. Тым не менш магчымасці на месцах, уласна кажучы, сёння не ў крыўдзе. Менавіта таму, што Указ кіраўніка дзяржавы № 21 даў пэўныя паўнамоцтвы мясцовым Саветам. Яны сёння маюць асобныя крыніцы фінансавання, могуць стварыць пэўныя гасразліковыя прадпрыемствы. Я лічу, што сістэма мясцовага кіравання на рэспубліканскім узроўні ўжо адладжаная. Больш за тое, асобныя моманты нашага мясцовага самакіравання і расіяне вывучаюць. Да прыкладу, гэта датычыцца структуры мясцовага Савета дэпутатаў, кворуму, прадстаўніцтва.

— У чым вы бачыце, Васіль Міхайлавіч, сваю ролю ў Савеце па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання, створаным пры Савеце Рэспублікі Нацыянальнага сходу?

— Каардынацыйны Савет створаны менавіта для таго, каб канкрэтна на месцах і высвятляць усе праблемы, якія існуюць, назапашваць базу для іх вырашэння на заканадаўчым узроўні. Вартая ўвагі, напрыклад, работа службаў у рамках выканання праграмы «аднаго акна» — праграма дае збоі вельмі часта. У студзені чакаецца выязное пасяджэнне, вызначыцца план работы Савета. Як член Савета, я буду працаваць у іншых рэгіёнах, назапашваць вопыт — гэта вялікая справа. Мяркую, што ў той жа, да прыкладу, Мінскай, Гродзенскай ці іншых абласцях убачу нейкае рацыянальнае зерне і, натуральна ж, буду старацца рэалізаваць убачанае і ў сваёй акрузе.

Ала МАЧАЛАВА.

ТРЭЦЬ АБ'ЕКТАЎ — ДАЎГАБУДЫ

Як паведамілі ў Нацыянальным статыстычным камітэце, на 1 снежня ў незавершаным будаўніцтве (без уліку індывідуальных забудоўшчыкаў і суб'ектаў малога прадпрымальніцтва) было каля 16 тысяч аб'ектаў вытворчага і невытворчага прызначэння. У пачатку гэтага года адпаведны паказчык быў меншы — 14,7 тыс.

Ад агульнай колькасці больш за ўсё прамысловых аб'ектаў — 42,7 працэнта. Часова прыпынена і закансервавана будаўніцтва 3,2 тыс. аб'ектаў. Паводле інфармацыі Нацыянальнага статыстычнага камітэта, узвядзенне больш чым трэці аб'ектаў (34,1 %) ажыццяўляецца з перавышэннем нарматыўных тэрмінаў працягласці будаўніцтва. Прасцей кажучы, гэта — даўгабуды.

Мікалай ЛІТВІНАЎ.

ЗАСНАВАЛЬНІКІ:
САВЕТ РЭСПУБЛІКІ НАЦЫЯНАЛЬНАГА СХОДУ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ,
ПАЛАТА ПРАДСТАЎНІКОЎ НАЦЫЯНАЛЬНАГА СХОДУ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ,
УСТАНОВА «РЭДАКЦЫЯ ГАЗЕТЫ «ЗВЯЗДА»

ГРАМАДСКІ САВЕТ:
НАВІЦКІ Г.В., старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні
БАЙКОЎ В.М., старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па дзяржаўным будаўніцтве, мясцовым самакіраванні і рэгламенце
АЦЯСАЎ А.Я., старшыня Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў
СЦЕПАНЕНКА А.М., адказны сакратар Савета па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання пры Савеце Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь
ПРЭДКА С.У., старшыня Ваўкавыскага раённага Савета дэпутатаў Гродзенскай вобласці
МАКСІМЕНКА С.А., старшыня Прылепскага сельскага Савета дэпутатаў Смалявіцкага раёна Мінскай вобласці

АДКАЗНАЯ ЗА ВЫПУСК:
Наталля КАРПЕНКА.
Кантактны тэлефон 292 21 03.

НЕ ДАЦЯГНУЛІ...

Днямі ў Брэсце адкрылі новую суперсучасную краму пад назвай «Супермаркет «Мікс» фірмы «Харчтавары». Узведзены найбуйнейшы гандлёвы комплекс у мікрараёне Кавалёва побач з Вяслярным каналам. Падчас цырымоніі адкрыцця было сказана шмат слоў пра зручнасць, сучаснасць і еўрапейскасць новага аб'екта. І гэта праўда, і ўсім добра. А вось жыхарам мікрараёна, тых дамоў, што справа ад крамы...

Васямнаццаць гадоў, з таго часу, як былі ўзведзены дамы, мы, іх жыхары, чакалі добраўпарадкавання. Каля аўтобусна-тралейбуснага прыпынку, як толькі дождж і снег — стаяла лужына па калена. Прыпынак добраўпарадкавалі пасля здачы Вяслярнага канала. А з пачатку вясны ўсё перакапалі — пачалі мяняць падземныя камунікацыі. Мы скакалі цераз ямы, лезлі цераз гурбы пяску і радаваліся, што нам, нарэшце, паправяць дарогу аж да самай аркі ў доме на пачатку вуліцы. Але трубы памянялі, засыпалі, праклалі асфальт і дарожкі да новага супермаркета, а кавалак дарогі ў 20-30 метраў, па якім штодня праходзяць сотні людзей, так і застаўся неўпарадкаваным. І зноў трэба мясіць гразь, псаваць абутак, скакаць цераз лужыны.

Вясной у невялікай харчовай краме, якая цяпер губляецца «ў цяні» супермаркета, давялося назіраць пацешную карціну. Зайшоў сюды імпазантнага выгляду грамадзянін, які,пэўна, толькі што перасек мяжу. Гаварыў ён па-англійску і па-нямецку. Па-руску ведаў добра два словы: «водка» і «граница». Гарэлкі ў краме не было, яму, агульнымі намаганнямі, спрабавалі растлумачыць, што гарэлка ў нас у невялікіх гандлёвых пунктах не прадаецца, трэба ісці ў краму за некалькі кварталаў. А ён не разумеў: «Граница — есть, водка — нет!?» А цяпер вось гарэлкі ў новым супермаркеце — хоць заваліся, а да еўрапейскасці... не дацягнулі нейкія 20 метраў. А трэба было б дацягнуць. Каб людзям зноў не скакаць цераз лужыны.

Святлана ЯСКЕВІЧ.

АКТУАЛЬНО

ОСТАВИТЬ ИЛИ ПЕРЕДАТЬ?

Разрешат ли сельисполкомам содержать на своем балансе спецтехнику?

В августе этого года сельские Советы получили письмо Министерства финансов «О применении отдельных статей экономической классификации расходов», в котором сельисполкомам запрещалось производить расходы по закупке газонокосилок, мотокос, кусторезов и бензопил, а также горючего и запчастей к ним.

Руководители первичного звена власти были, мягко говоря, озадачены: как же теперь заниматься благоустройством? Ведь многие только что приобрели необходимую технику и радовались тому, что наконец-то можно будет ухаживать за территорией цивилизованным способом. Тогда «МС» обращалось за комментарием в Минфин, но нам предложили подождать до конца года, объяснив, что ситуация с закупкой и обслуживанием техники может еще измениться.

На днях мы встретились с **начальником главного управления бюджетной политики Министерства финансов Максимом ЕРМОЛОВИЧЕМ** и задали ему несколько вопросов, касающихся поднятой темы.

— Максим Леонидович, в связи с чем было принято решение прекратить закупку сельскими Советами техники, которая используется для благоустройства территории?

— Принято оно было в связи с тем, что в соответствии с Указом № 21 расходы сельисполкомов на благоустройство не включают в себя приобретение газонокосилок, кусторезов и т.п., и нет возможности за счет средств местных бюджетов финансировать такие расходы. (Сегодня на балансах сельских и поселковых исполкомов находится 1942 единицы технических средств, в том числе и комбайны.)

Но вместе с тем мы ведь анализируем и практику. И, исходя из практики, принимаем решение о целесообразности тех или иных расходов. А поскольку такая практика (когда именно сельский Совет занимался благоустройством) складывалась годами, мы пришли к выводу, что резко разрушать сложившиеся традиции финансирования все же нельзя.

К тому же, и у районных жилищно-коммунальных служб не всегда имеется возможность приезжать на село, обкашивать газоны, наводить порядок на кладбищах и так далее. Поэтому сейчас даны указания казначействам, чтобы **расходы по эксплуатации и ремонту техники сельисполкомов временно производились** — до тех пор, пока мы окончательно не определим, насколько это необходимо в тех или иных сельсоветах и есть ли там возможность передать хозяйственные функции специализированным организациям.

Большинство расходов на первичном уровне можно разделить по трем направлениям. Первое — это хозяйственная деятельность. (Здесь однозначно вся техника должна содержаться за счет внебюджетных доходов.) Второе направление — это расходы, связанные с благоустройством. (По результатам проведенного анализа мы вынуждены констатировать, что отказаться от этих расходов сельисполкому пока невозможно — это и дешевле, и эффективнее.) И третье направление деятельности — это оказание помощи населению в уборке урожая, в различных видах работ.

Сегодня техника, находящаяся на балансах сельисполкомов, используется по всем этим направлениям. Но содержать тот же комбайн достаточно накладно — его надо ремонтировать, заправлять, искать человека, который будет на нем работать. А с другой стороны, есть опыт Минской области, которая создала специализированные коммунальные участки на территории сельских Советов. Там работают люди, которые выполняют весь комплекс работ по благоустройству, они специально этому обучены, получают за это заработную плату. И сельский Совет по договору с этим участком оплачивает все виды расходов по благоустройству.

В идеале такие участки должны быть созданы на территории каждого сельсовета. Но далеко не все сельсоветы имеют такую возможность. Некоторые находятся достаточно далеко от районного центра, да и объемы работ у них небольшие — получается, что нецелесообразно создавать там коммунальный участок. В таком случае лучше, чтобы вся техника находилась на балансе сельисполкома, а рабочие привлекались по договорам, как это делается сейчас.

Поэтому, пока окончательно не решены все вопросы, закупку техники мы временно приостановили, но расходы по ее эксплуатации, по содержанию пока сохраняем — сюда входят затраты на горючее и запасные части.

— А когда будет принято окончательное решение?

— Думаю, это произойдет в ближайшее время. Вопросы закупок напрямую связаны с общей бюджетной политикой, а здесь подходы будут ужесточаться.

Чем дальше мы будем развивать и укреплять материально-техническую базу сельских Советов, тем больше они будут уходить от выполнения хозяйственных функций, передавая их специализированным организациям.

— Технику тоже нужно будет передать?

— Да, нужно. Потому что содержать за небольшой сельсоветский бюджет комбайн или газонокосилку — это дорого, неэффективно и, повторяю, не характерно для функций органов управления. Но кому именно будет передаваться техника, еще не решено. В ближайшее время мы должны изучить проблему оказания помощи жителям села по обработке приусадебных участков, уборке урожая и сбору молока в личных подсобных хозяйствах. Возможно, что эти функции со временем смогут взять на себя СПК, которые находятся на территории сельсоветов. Тогда можно было бы и комбайны передать СПК — для того, чтобы они использовались не только для уборки приусадебных участков, но и в производственном процессе.

— Допустим, при сельисполкоме уже создано коммунальное унитарное предприятие и вся техника находится на его балансе. Что будет с нею?

— КУПы как работали, так и будут работать. Никто их закрывать не собирается. Это хозяйственные организации, которые самофинансируются. Есть все основания для того, чтобы они продолжали свою работу и получали деньги из бюджета по договорам.

— А если сельские Советы занимаются сбором молока и имеют для этого технику и определенный инвентарь — с ним что будет?

— Ничего. Это внебюджетная деятельность сельского Совета. И лошади, имеющиеся в сельских Советах, предназначены в основном для сбора молока. Как правило, их содержание, приобретение инвентаря, а также работа по сбору молока и привлечение лиц, которые этим занимаются — все это осуществляется за счет внебюджетных доходов. Т.е. не противоречит законодательству, так как бюджетные средства на это не расходуются. Многие сельские Советы зарабатывают себе таким образом дополнительные средства и используют их на то же благоустройство, укрепление своей материальной базы.

— Значит, со временем благоустройством территории сельсовета будет заниматься ЖКХ?

— Этим будет обязано заниматься ЖКХ — за счет средств бюджета сельского Совета. То есть сельисполком будет выступать как заказчик. Но, повторяю, если где-то такую практику невозможно будет внедрить в силу объективных причин, за сельисполкомом сохранятся и техника, и обязанности по наведению порядка на территории.

Наталия КАРПЕНКО.

ЗАЛАТАЯ МІНА ПАДПОЛЬШЧЫЦЫ

Да 100-годдзя Героя Савецкага Саюза Марыі ОСІПАВАЙ

У гады вайны Мінск па частаце згадак у зводках з франтоў займаў чацвёртае месца пасля Масквы, Ленінграда і Сталінграда. Такім вялікім быў рэзананс паспяховага правядзення ў верасні 1943 года аперацыі па ліквідацыі намесніка Гітлера, генеральнага камісара Беларусі Вільгельма Кубэ. Асобая роля ў выкананні знакамітай акцыі помсты належыць Марыі Барысаўне Осіпавай.

Фота БЕЛТА.

Яна нарадзілася 27 снежня 1908 года ў вёсцы Серкавіца Талачынскага раёна. Бацькі, Барыс Цітавіч і Агаф'я Іванаўна, назвалі яе Марыяй, што, на іх думку, азначала «святая». Марыя ў сям'і патомных рабочых была перадапошнім дзіцем. Упершыню перамагла страх, калі аднойчы ў зімовую начную сцюжу адолела васьмікіламетровы шлях без суправаджэння дарослых. У няпоўныя 14 гадоў стала паўнапраўнай працаўніцай мясцовага шклозавода. Аб гэтай старонцы свайго лёсу М.Б. Осіпава ў аўтабіяграфіі піша: «Шклозавод, які стаяў амаль у цэнтры Серкавіц, быў нашым карміцелем. Ад яго мы залежалі, ён быў адзіным сродкам існавання жыхароў пасёлка. Мае старэйшыя браты Алёша і Федзя таксама з дзесяці гадоў ужо былі на заводзе.

...Пераход да новага жыцця вельмі змяніў людзей. Настрой ва ўсіх быў прыўзняты. Змяніліся, пасвятлелі твары, сталі іншымі адносіны да працы, да свайго жыцця. Роўнасць аб'ядноўвала людзей. Часта нас, маладых дзяўчат, рабочыя прасілі пець песні. А мы і рады былі. Бывала, пакуль працуем, перапяём усё — і беларускія народныя, і абрадавыя, і рэвалюцыйныя песні. За спевамі і час ляцеў непрыкметна».

У адным з архіўных фондаў Віцебскай вобласці знаходзіцца пратакол пасяджэння камісіі пры Полацкім акругкаме КП(б)Б ад 13 верасня 1928 года. У ім запіс: «Сакаўцова-Осіпава (па мужу. — **Аўт.**) Марыя Барысаўна, рабочая, кандыдат ВКП(б) з 29 кастрычніка 1926 года. Пастановай ячэйкі друкароў ад 23 ліпеня 1928 года пераведзена ў члены. Зацвярджаецца членам ВКП(б) ад 23 ліпеня 1928 года».

У 1933 годзе Марыя Барысаўна разам з мужам пераязджае ў Мінск, дзе паступае ў Вышэйшую камуністычную сельскагаспадарчую школу Беларусі. У 1935 годзе пераводзіцца ў Мінскі юрыдычны інстытут, які паспяхова закончыла за год да нападу Германіі на СССР.

У 1941 годзе М. Осіпава — дыпламаваны юрыст, член КП(б)Б з 12-гадовым стажам, член Вярхоўнага Суда Беларускай ССР, жонка і маці дваіх дзяцей: Тамары (12 гадоў), Юрыя (хадзіў у дзіцячы сад ок). Муж, Якаў Осіпаў, з аб'яўленнем аб пачатку вайны атрымаў прадпісанне з ваенкамата. З першых дзён акупацыі Мінска нараджалася і супраціўленне няпрошаным чужынцам. Сярод яго арганізатараў і ўдзельнікаў назаўсёды атрымала прапіску і імя Марыі Барысаўны Осіпавай.

Осіпава здагадвалася аб існаванні ў немцаў спісаў з прозвішчамі даваенных савецкіх актывістаў. Пацвярджэннем гэтаму стаў яе выклік у нячмецкую жандармерыю. Самавалданне і ўмелыя адказы дазволілі ёй і яе дачцэ Тамары пазбегнуць арышту, але прымусілі перайсці на нелегальнае становішча. Пастаяннага месца кватаравання яна не мела, з канца 1942 г. часцей за ўсё гасцявала ў Ліпскіх (вул. Заслаўская, 35), Грыбоўскай Марыі (вул. Заслаўская, 35), Драздовых (вул. Заслаўская, 33). Уключэнне ў нелегальную антыфашысцкую дзейнасць было поўнасцю ўсвядомленым, без ніякіх знешніх падштурхоўванняў. У 1941—1942 гг. яна з падпольшчыцы-адзіночкі становіцца кіраўніком тэрытарыяльнай падпольнай групы, у якую ўваходзілі Сакалова Антаніна, Малаковіч Марына, Ліпская Галя, Дрозд Мікалай Пракоф'евіч, Дрозд Алёна Адамаўна, Дрозд Рэгіна, Кулікоў Георгій, браты Уладзімір і Канстанцін Сянько, Грыбоўская Марыя, Тужыкаў Мікалай, Алісіёнак Міхаіл і інш. Усяго ў групе Осіпавай было каля 50 чалавек (звесткі на верасень 1943 г.), з іх загінула 18.

Падпольная дзейнасць была рознай — ад напісання і распаўсюджання антыфашысцкіх лістовак да ўстанаўлення і падтрымання цеснай сувязі з шэрагам партызанскіх атрадаў, узброеных моцнымі радыёстанцыямі. У канцы 1941 г. падпольшчыца знаёміцца з членам Мінскага падпольнага ГК КП(б)Б А.А. Коцікавым і праз яго з кіраўніком мінскага падпольнага супраціўлення — І.К. Кавалёвым. Аб даверы да Осіпавай сведчыць і такі факт, як правядзенне некалькіх пасяджэнняў агульнагарадскога падпольнага цэнтра (Мінскага падпольнага ГК КП(б)Б) на вул. Заслаўскай, у кватэры, якую часова здымала падпольшчыца. Свой уклад яна ўнесла ў аднаўленне выдання беларускамоўнай «Звязды» ў акупаваным немцамі Мінску, зборы звестак аб лёсе арыштаваных немцамі падпольшчыкаў, у выратаванне і вывад у лес шэрагу савецкіх ваеннапалонных, вязняў гета. На жаль, у канцы 1942—пачатку 1943 г., у час зараджэння ганебнага абвінавачвання ўхілу да Мінскага падпольнага ГК КП(б)Б на чале з І.К. Кавалёвым, цень падазронасці з боку НКУС СССР лягла і на М.Б. Осіпаву. Размова ішла ні менш ні больш як аб выдачы немцам актыўных падпольшчыкаў, супрацоўніцтве з акупантамі... Потым гэтыя абвінавачанні былі цалкам адхіленыя як пабудаваныя на чутках, домыслах.

Вывучэнне перыпетый патрыятычнай дзейнасці М.Б. Осіпавай істотна пралівае святло амаль на ўсе этапы аперацыі па знішчэнні нямецкага гаўляйтэра Вільгельма Кубэ. Сёння мы яшчэ раз звяртаемся да некаторых малавядомых падрабязнасцяў уручэння падпольшчыцы выбуховых рэчывавў у сярэдзіне верасня 1943 г. у партызанскай брыгадзе «Дзімы». Прыводзім на гэты конт урывак з успамінаў былога камандзіра разведвальна-дыверсійнай групы гэтай брыгады Пятра Дзмітрыевіча Трашкова: «Дэталі дыверсіі над Кубэ мы абмяркоўвалі з Мікалаем Пятровічам Фёдаравым (камандзір брыгады. — **Аўт.**) у хаце сяброў партызанаў Пятра і Фёклы Вярбіцкіх (знаходзілася на ўскраіне вёскі Янушкавічы Лагойскага раёна, на беразе невялічкага, але глыбокага возера, у 1984 г. па чыімсьці загадзе разбураная, нібы з-за старасці. — **Аўт.**). Тут быў наш штаб. Не ведаў обер-кат, што ёсць на беларускай зямлі хата-суддзя, якая вынесе і прывядзе ў выкананне свой справядлівы народны прысуд. У самым пачатку адной верасняўскай раніцы 1943 г. я навучыў М.Б. Осіпаву, як ставіць міну на баявы ўзвод, як надзейна замініраваць ложак ката. У гэтай хаце мы з памочнікам М.П. Фёдарава Сяргеем Хрэнавым знайшлі надзейны спосаб дастаўкі міны ў Мінск. Спрабавалі ўкласці ў бохан хлеба вясковай выпечкі. Не падышло. Вярбіцкая прынесла з агарода гарбуз. Выбралі месца ў гарбузе для міны, уклалі, закрылі — прыметна. «А што, калі міну ўкласці ў маленькі кошык і засыпаць брусніцамі», — прапанаваў я. Вярбіцкая прынесла набор кошыкаў. Я выбраў самы малы. Праз вуліцу дзяўчына Надзя Бялькевіч напярэдадні з лесу прынесла шмат ягадаў. Я ў яе пазычыў кілаграма паўтара брусніцаў, уклаў міну ў кошык і засыпаў ягадамі. Осіпава пагадзілася на такі варыянт. Але сумненне ў яе ўзнікла. «Ведаеш, — сказала яна, — гэта ж вітаміны, адбяруць». «Не адбяруць, — запярэчыў я. — На ягады пакладзём паўдзясятка яек. Будзеш падыходзіць да кантрольна-прапускнога пункта, надбі пару яек і гэтым змесцівам размаж па ягадах. Такія ягады немчура есці не захоча». «Мабыць, ты маеш рацыю». Осіпава пайшла з хаты на возеры радавой разведчыцай, а вярнулася Героем Савецкага Саюза».

11 лістапада 1967 г. дырэкцыя партыйнага архіва КПБ накіравала першаму сакратару ЦК КПБ П.М. Машэраву пераклад дакладу кіраўніка Асобай нямецкай следчай камісіі Бендорфа аб забойстве В. Кубэ ў ноч на 22 верасня 1943 г., выяўлены архівістамі ў Кіеве сярод мікрафільмаў, купленых у ЗША. З матэрыялам у будынку ЦК КПБ азнаёмілі ў ліку першых М.Б. Осіпаву і А.Р. Мазанік. Абедзве былыя падпольшчыцы назвалі толькі некалькі нязначных разыходжанняў з іх заявай у Маскве ў кастрычніку 1943 г. Параўнанне поглядаў яшчэ раз пацвердзіла выснову аб тым, што генеральны камісар Беларусі, намеснік Гітлера ў генеральнай акрузе Беларусь Вільгельм Кубэ быў падарваны ў сваёй спальні агульнымі намаганнямі мінскіх падпольшчыц Марыі Осіпавай, Алены Мазанік і Надзеі Траян. Сярод недастаткова даследаванага — уклад разведвальнай і дыверсійнай дзейнасці Мінскага падпольнага ГК КП(б)Б, пачынаючы з вясны 1942 г. і да моманту здзяйснення знакамітай аперацыі. Але гэта ніяк не ўплывала на заслужанае прысваенне патрыёткам высокага ганаровага звання Героя Савецкага Саюза.

Марыя Барысаўна Осіпава заняла сваё месца ў напісанні гісторыі Мінскага антыфашысцкага падполля. Але рабіла яна гэта не алоўкам ці ручкаю, а ўкладам у барацьбу за вяртанне годнага імя дзясяткаў, соцень мінскіх падпольшчыкаў. Доўгі час, амаль 15 гадоў, над гісторыяй Мінскага падполля з ліпеня 1941 па верасень 1943 г., віселі ярлыкі рознага роду абвінавачанняў. Перагляд іх, пачынаючы з 1945—1946 гг., вёўся шляхам стварэння больш як 10 спісаў удзельнікаў патрыятычнага руху. Пад самым вялікім з іх (каля 300 прозвішчаў) стаіць подпіс Осіпавай як даверанай, адказнай асобы. Дзякуючы такім намаганням у канцы 50-х гадоў вызвалена ад паклёпаў больш за 100 удзельнікаў падпольнай барацьбы, створана першая дакументальная база для напісання навуковых прац.

Пасля вайны М.Б. Осіпава зноў працуе на пасадзе члена Вярхоўнага Суда БССР, выбіраецца дэпутатам Вярхоўнага Савета БССР. Яна правяла мноства сустрэч з рознымі катэгорыямі насельніцтва, асабліва з моладдзю, у тым ліку нямецкай. Патрабавала аднаго: права разгляду любога пытання ў кантэксце часу. Супраць былі толькі невялічкія групкі запраграмаваных праціўнікаў. Сэрца слаўнай дачкі беларускага народа Марыі Барысаўны Осіпавай перастала біцца 5 лютага 1999 года, але памяць аб ёй застанецца назаўсёды.

Яўген БАРАНОЎСКІ,
кандыдат гістарычных навук.

УП «Минский городской центр недвижимости»

ПОВТОРНО ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

по продаже единым лотом имущества детского оздоровительного лагеря «Бригантина», (балансодержатель — УП «Завод точного машиностроения «Планар-ТМ»), расположенного по адресу: Минская область, Молодечненский район, 0,5 км севернее д. Петровщина, детский оздоровительный лагерь «Бригантина». В состав лота входит следующее имущество:

№ п/п	Наименование объектов	Инв. №
1	Физкультурно-оздоровительный комплекс (общая площадь – 283,7 кв.м)	630/С-47603
2	Котельная с навесом (общая площадь – 396,4 кв. м)	630/С-47604
3	Детсад-ясли корпус № 1 (общая площадь – 1276,0 кв. м)	630/С-47605
4	Трансформаторная подстанция (общая площадь – 18,0 кв. м)	630/С-47607
5	Административно-приемный корпус (общая площадь –101,1 кв. м)	630/С-47608
6	Детсад-ясли на 140 мест корпус № 2 (общая площадь – 1096,1 кв. м)	630/С-47609
7	Здание специализированное для лечебно-профилактических и санаторно-курортных целей (общая площадь – 732,4 кв. м)	630/С-49350
8	Здание специализированное для общественного питания (общая площадь – 1749,6 кв. м)	630/С-49353
9	Здание специализированное для лечебно-профилактических и санаторно-курортных целей (общая площадь – 735,4 кв. м)	630/С-49354
10	Канализационно-насосная станция (общая площадь – 23,5 кв. м)	630/С-47570
11	Склад (общая площадь – 165,1 кв. м)	
12	Бытовое здание для обслуживающего персонала (общая площадь – 131,8 кв. м)	
13	Кабельная линия	
14	Внешние кабельные сети	
15	Наружное освещение	
16	Наружные сети тепловые, водопроводные и т.п.	
17	Наружная канализация	
18	Водопровод с артскважиной	
19	Водонапорная башня	
20	Устройство подъездной автодороги	
21	Ограждение с воротами	
22	Противопожарный подъезд к водоему	
23	Котел Минск-1	
24	Котел Минск-1	
25	Теплообменник Р-025-8,9-1Х	
26	Лифт грузовой малый	
27	Лифт грузовой г/п 100 кг	
28	Таль электрическая МЗ-320	

Начальная цена – 2 133 716 497 белорусских рублей.

Земельный участок площадью 11,75 га (в том числе: земельный участок площадью 10,3544 га кадастровый номер 623881300098000008, земельный участок площадью 0,0232 га кадастровый номер 62388130098000007, земельный участок площадью 1,3754 га, кадастровый номер 623881300098000009) предоставлен для эксплуатации и обслуживания зданий и сооружений детского оздоровительного лагеря «Бригантина».

К участию в аукционе допускаются юридические и физические лица, предоставившие организатору аукциона следующие документы:

заявление на участие в аукционе; заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, условиями проведения аукциона; нотариально заверенные копии учредительных документов (для юридических лиц) и свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах); заверенную банком копию платежного поручения, подтверждающего внесение задатка; а также иные документы в соответствии с условиями проведения аукциона.

Задаток в размере 200 000 000 белорусских рублей перечисляется на расчетный счет УП «Минский городской центр недвижимости» № 3012024570010 в филиале ОАО «БПС-Банк» по Минской области, г. Минск, бульвар им. В. Мулявина, 6, код 153001331; УНП 190398583.

Победителем торгов признается участник, предложивший наивысшую цену за продаваемый объект. Порядок проведения торгов указан в условиях проведения аукциона.

Аукцион состоится **15 января 2009 года** в 14.30 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Заявления на участие в аукционе и необходимые документы принимаются по **13 января 2009 года** до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. № 6.

Телефоны для справок: (017) 227 48 36, 227 40 22.

УНП 190398583.

Тэлесеткі

РАНІЦА ДОБРАЙ... БЫВАЕ!

Пераднавагодні час у журналістаў практычна ўсіх СМІ, ды і не толькі ў іх, характарызуецца адным ёмістым выразам — «вар'яцкі дом». Беганіна, сустрэчы, здымкі, заканчэнне важных праектаў, раздача даўгоў і падчыстка «хвастоў»... І пры гэтым яшчэ трэба захоўваць творчую актыўнасць і святочны настрой. А як ты яго захаваеш, калі ў працы — цэйтнот, у думках — мешаніна, ды яшчэ пад нагамі класічнае незразумела што, то слота, то галалёдзіца, цямнее рана, святлее позна, нават прачынацца не хочацца! У нармальны бадзёры стан многіх з нас вяртае кубак кавы і — ранішняя тэлепраграма, пад якую так добра рабіць зарадку, адначасова запамінаючы прагноз надвор'я і ўдакладняючы планы на дзень. Бо сорамна сонным суслікам хадзіць па кватэры, калі бачыш свежых, падцягнутых і аптымістычных вядучых — а яны ж, мабыць, падымаюцца значна раней за цябе?..

Сакрэтнымі рэцэптамі, як зрабіць любую раніцу добрай, колькі гадзін сну дазваляюць захаваць выдатны знешні выгляд, і як зрабіць так, каб зранку 1-га (а для асабліва актыўных — 2-га) студзеня не балела галава, з намі дзеляцца «раннія пташкі» з АНТ — вядучыя суботняга выпуску праграмы «Наша раніца» Вольга Багатырэвіч і Яўген Булка.

— Эфірная «Наша раніца», якую вы ведзяце, пачынаецца з сямі гадзін. А калі звычайна пачынаецца ваша раніца?

Вольга: Гледзячы якая — у будны дзень або ў выхадны. Паспаць люблю — бо я «сава», магу з лёгкасцю працаваць гадзін да 3-х ночы, нават дома знаходжу сабе работу, але потым і адпачываю як след... Мне трэба мінімум сем гадзін сну, каб адчуць сябе адпачылай і бадзёрай. У выхадныя ўвогуле стараюся не спяшацца нікуды. Але разам з тым я чалавек лёгкі на пад'ём, калі трэба, падымуся ў любы патрэбны час, а дасплю потым — днём, напрыклад.

Яўген: Таксама па-рознаму. Будні, калі я працую на радыё, пачынаюцца ў 5.30, хоць я — глухая «сава», устаю толькі таму, што ведаю: трэба. Калі ж няма эфірнага тыдня, сплю да дванаццаці, а то і да гадзіны. Але і спаць кладуся пры гэтым не раней за 3 гадзіны ночы. У выхадныя дазваляю сабе паспаць даўжэй.

— Для тэлеглядачоў зранку самая каштоўная інфармацыя — прагноз надвор'я. А якія рубрыкі ў праграме найбольш падабаюцца вам?

Вольга: Ёсць такі момант — гэта «Сямейны савет», калі да нас прыходзяць госці і разважаюць на пэўную тэму. Жывы кантакт — заўжды цікава, даведваешся пра штосьці новае, знаёмішся з новымі людзьмі...

Яўген: Пагаджуся, для мяне заўжды важна наяўнасць у студыі гасцей, з імі вельмі цікава размаўляць. Каб чалавек не адчуваў сябе перад камерай заціснутым, мы пачынаем стасункі адразу ж, яшчэ да праграмы — і часам людзі нават не заўважаюць, што здымкі пачаліся ўжо.

— Многія кажуць, «раніца добрай не бывае». Як вы лічыце, ці можна зрабіць, каб яна заўжды была добрай?

Вольга: Не трэба глядзець ні на надвор'е, ні на аб'ём працы, які цябе чакае — усё адно ўстаць раней і пачаць дзень з любімай справы. Хтосьці ўключыць «Нашу раніцу» і разам з намі будзе зараджацца пазітывам, хтосьці пойдзе ў спартзалу, ці зоймецца шопінгам — каму што бліжэй. Яшчэ вельмі дапамагае, калі распланаваць дзень літаральна на гадзінах — тады часу на хандру не застанецца. А мне асабіста дапамагаюць настроіцца на добры лад зарадка і душ — лепшага спосабу, здаецца, ніхто яшчэ не прыдумаў.

Яўген: Увогуле, я лічу, заўжды трэба перад тым, як легчы спаць, падумаць пра тое, што неабходна зрабіць заўтра, і пераканаць сябе, што ўсё атрымаецца. А ўставаць трэба ў той момант, калі думаеш пра штосьці добрае — яшчэ, магчыма, нават вочы не расплюшчыў, прысніў нешта прыемнае — калі злавіць гэту хвалю пазітыву, яна захаваецца на ўвесь дзень, бо калі пачынаць думаць: «Ну вось, зно-о-оў трэба ўставаць і кудысьці там цягнуцца», — з такім самотным настроем дзень і пройдзе.

Сяргей ХОМІЧ, кіраўнік дырэкцыі ранішняга вяшчання АНТ: У гэтым звышзадача праграмы «Наша раніца» — не толькі расказаць людзям, што адбылося ў краіне і свеце, але і з дапамогай гэтай інфармацыі стварыць добры, светлы ранішні настрой, дадаць кроплю аптымізму ў кожную раніцу.

— Адны жывуць паводле прынцыпу «Пераначуеш, то болей пачуеш», іншым больш падабаецца дэвіз «Раніцай — грошы, вечарам — крэслы». Якое з папулярных «ранішніх» выслоўяў вам бліжэй?

Вольга: О, так адразу нават не ведаю...

Яўген: Хто рана ўстае... той не высыпаецца! Гэта праверана на ўласным вопыце.

— Ваш рэцэпт: што трэба ўлічыць, каб зранку 1 студзеня не балела галава?

Вольга: Трэба адэкватна адзначаць Новы год і думаць пра наступствы! Хоць галава можа балець і ў пераносным сэнсе — тады аб яе (і сваім) здароўі трэба таксама паклапаціцца загадзя. Каб сустрэць новы год з чыстым сумленнем — раздаць усе даўгі, скончыць важную працу. І нават калі не атрымаецца штосьці завяршыць у тэрмін — настроіцца на лепшае, не «парыцца», як кажуць, адпачыць як след, але мець на ўвазе, што пасля святаў неабходна будзе папрацаваць. (У Вольгі, напрыклад, якраз на пачатку года — сесія ва ўніверсітэце, таму дзяўчына ўжо нацэлена на паспяховую здачу экзаменаў. — **Аўт.**).

Асабіста для мяне Новы год — любімае свята з дзяцінства, і я стараюся захаваць гэту казачную атмасферу для сябе і блізкіх людзей. У нас гэта па традыцыі сямейнае свята, сёлета будзем адзначаць у рэстаране. Можа гэта і банальна, але для нас больш важна, не дзе сустракаць, а як і з кім — каб уся сям'я сабралася за сталом...

Яўген: Не ведаю, не ведаю, у мяне галава 1 студзеня ніколі не баліць. Можа, таму, што трэба ўмець разлічваць сілы з алкаголем? А яшчэ лепш дазволіць сабе ў гэты дзень паспаць, падняцца пазней, затое поўным сілаў.

Гэты Новы год я сустрэну, хутчэй за ўсё, на працы, як заўжды. *(Задумваецца.)* Хоць, можа быць, і дома адзначыць удасца — паглядзім.

Дарэчы

«Наша раніца» працуе 364 дні ў год (у высакосны, як сёлета — 365); праграма бярэ выхадны і дазваляе сабе не выходзіць толькі 1 студзеня.

Штодня ў кадры мы бачым дваіх вядучых. Усяго ў «Нашай раніцы» іх тры пары: Валерый Кашчэеў—Люся Лушчык, Сяргей Дарафееў—Наталля Радзіна, Яўген Булка—Вольга Багатырэвіч, а па-за кадрам застаецца яшчэ пастаянная рэдактарская група — 10 чалавек.

Абсалютная большасць касцюмаў, у якіх мы бачым вядучых у кадры — іх уласны выбар, стылісты і грымёры толькі даюць некаторыя парады. Сяргей Дарафееў і Наталля Радзіна, напрыклад, загадзя тэлефануюць адзін аднаму і ўдакладняюць, хто ў чым будзе ў студыі.

Па буднях у праграме выходзіць звыш 30 рубрык на самыя розныя тэмы — ад гараскопаў да гістарычнага агляду, ад кулінарных рэцэптаў да высокай моды; у выхадныя рубрык удвая менш.

— Не мнагавата інфармацыі для раніцы? — пытаюся ў дырэктара дырэкцыі ранішняга вяшчання Сяргея Хоміча.

— Ідэя ў тым, каб гэтыя рубрыкі былі кароткія, але максімальна цікавыя для рознай аўдыторыі — і хатніх гаспадынь, і для дзяцей, і для пенсіянераў, і для чыноўнікаў, і для рабочых... У наступным годзе, 3 лютага, праграма святкуе 5-годдзе, у сувязі з чым рыхтуецца маштабнае абнаўленне яе зместу і афармлення — амаль на 90 працэнтаў, — з сабой у наступную пяцігодку возьмем зусім нямнога. Са студзеня абодва выпускі выхадных, суботні і нядзельны, будуць весці Яўген Булка і Оля Багатырэвіч, задача якіх — зрабіць больш вясёлую, жывую, бадзёрую праграму, чым у будныя дні. Вызначымся і са стылістыкай: калі цяпер «Наша раніца» — гэта мікс з інфармацыйнай і забаўляльнай частак, то ў новым годзе зробім накірунак праграмы больш канкрэтным. Так што чакайце кардынальных пераменаў!

У новую раніцу і Новы год зазірала **Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**

Усходні гараскоп на тыдзень

ШАЛІ МОГУЦЬ АТРЫМАЦЬ ПРЭМІЮ, А ЛЬВАМ НЕ ГРЭХ ПАСМЯЯЦЦА НАД САБОЙ

ВАЕН. На ўсё, што адбываецца, варта глядзець па-філасофску. Гэта звычайная мітусня, а вы можаце атрымаць карысць проста назіраючы за развіццём падзей. Удзельнічаць не варта. Калі ў аўторак яшчэ дапушчальны апошні ўсплёск актыўнасці, то ў другой палове тыдня гэта можа прывесці да канфліктных сітуацый з навакольнымі, стратай сілаў і магчымасцяў.

ЦЯЛЕЦ. Пажадана скараціць аб'ём работы, якую неабходна выканаць. Прысвяціце больш часу адпачынку. Не насіце ў сабе крыўдаў, яны — крыніцы хваробаў. І чым хутчэй вы ад іх пазбавіцеся — тым лепш. Важныя пытанні, якія намечаны на аўторак, пажадана вырашыць да абеду і ні ў якім разе не адкладвайце абед на вечар. Залішняя эмацыянальнасць і неасцярожныя словы могуць ускладніць адносіны з калегамі па працы, таму сачыце за сваімі словамі.

БЛІЗНЯТЫ. Спатрэбіцца моцная вытрымка, каб самалюбства не перашкаджала жыць. Пастарайцеся некалькі зменшыць свой апетыт у фінансавай галіне. На шляху да высокіх дасягненняў істотнай перашкодай могуць стаць коснасць і кансерватызм. У сераду, выкарыстоўваючы дыпламатыю, можаце дасягнуць поспеху, калі не перашкодзіць гордасць.

РАК. Неабходна вызначыць планы на тыдзень, бо ён будзе дастаткова напружаны. Пажадана не прыспешваць падзеі, інакш не зможаце аб'ектыўна разлічыць свае сілы. Надайце дастаткова часу вырашэнню старых праблем. Дапамога сяброў і блізкіх вам забяспечана. У сераду давядзецца прыкласці шмат намаганняў, каб захаваць душэўную раўнавагу. Пасля бурнай серады чацвер і пятніца будуць спакойнымі.

ЛЕЎ. Пастарайцеся пазбавіцца ад усяго непатрэбнага, дробнага, таго, што перашкаджае як у прафесійнай дзейнасці, так і ў асабістым жыцці. У аўторак не замыкайцеся ў сабе і не адмаўляйцеся ад дапамогі сяброў. Пазбягайце мітусні і не бойцеся смяяцца над сабой. У пятніцу пажадана навесці парадак у хатніх справах. Прысвяціце больш часу дзецям.

ДЗЕВА. Спраў становіцца ўсё больш і больш, а часу застаецца ўсё менш і менш. Не перажывайце: усе праблемы вырашальныя, калі вы праявіце сабранасць, уважлівасць і засяроджанасць. Дзеці парадуюць поспехамі і дасягненнямі. Веды, якія атрымаеце, пажадана адразу ж прымяніць на практыцы, каб дасягнуць эфектыўных вынікаў.

ШАЛІ. Не ўспрымайце тое, што адбываецца, занадта сур'ёзна. Падумайце пра планы на будучыню. На працы ўсё будзе добра, нават верагодна павышэнне па службе ці прэмія. Варта задумацца пра тое, што вашаму прафесійнаму ўзроўню неабходна абнаўленне. Можаце для размінкі асвоіць новую прафесію. Дзецям спатрэбіцца парада: пастарайцеся заўважыць гэта перш, чым яны паспеюць натварыць глупства.

СКАРПІЁН. Адчувайце асалоду плывучы па цячэнні, аддавайцеся асалодзе і фантазіям. Можаце нечакана для сябе апынуцца ў элітарным коле ці перажыць лёсавызначальную сустрэчу. У панядзелак не варта слепа давяраць меркаванню іншых — прыслухайцеся лепш да сваёй інтуіцыі. Базу для трывалага падмурка наступных падзей лепш закладваць самастойна, ні на каго не разлічваючы.

СТРАЛЕЦ. Вас чакаюць цікавыя сустрэчы і знаёмствы. Можаце адчуць у сабе такія сілы, што будзеце гатовы разбурыць горы. Аднак некаторыя справы і падзеі будуць ісці не так хутка, як хацелася б. Не расчароўвайцеся ў сабе — проста часткова перанясіце рэалізацыю праектаў і набярыцеся цярпення. У стасунках з сябрамі, блізкімі і калегамі па працы не спяшайцеся з высновамі, загадзя абдумвайце кожны крок, імкніцеся да разумнага кампрамісу.

КАЗЯРОГ. Тыдзень вельмі ўдалы ў плане кар'еры. Могуць паступіць цікавыя дзелавыя прапановы. Таксама верагодныя знаёмствы з карыснымі людзьмі. Калі засяродзіцеся і праявіце ўвагу, то вам будзе забяспечаны поспех на працы, прычым такі, на які вы нават не разлічвалі. Пажадана не раскрываць навакольным свае планы і мэты. Не ўхваляць.

ВАДАЛЕЙ. Вакол вас сабралася насычанае інфармацыйнае поле — і вы, верагодна, з цяжкасцю зможаце пераварыць новыя звесткі, якія паступаюць з усіх бакоў. Ад аб'ёму выканання работы будзе залежаць узнагарода, якую атрымаеце. Але не забывайцеся пра адпачынак і не працуйце ва ўрон здароўю. Не варта вінаваціць сябе ў тым, што разладзіліся адносіны з некаторымі калегамі па працы: магчыма, хтосьці зайздросціць вашым поспехам.

РЫБЫ. На працы, якія б намаганні ні прыкладалі, істотных зменаў пакуль не прадбачыцца. Але, нягледзячы на гэта, можа з'явіцца рэальны шанц падняцца па кар'ернай лесвіцы. У сераду можаце смела разлічваць на дапамогу і мудрую параду сяброў. У чацвер лепш не прымаць паспешлівых рашэнняў — неабходна ўсё дакладна прадумаць і аб'ектыўна ацаніць. Субота парадуе цікавай інфармацыяй, якая дазволіць змяніць у лепшы бок стан спраў на працы.

Результаты розыгрыша рекламной игры

«Королевские подарки 2»

В период с 01 ноября 2008 года по 25 декабря 2008 года (включительно) в казино «Royal» проводилась рекламная игра

В игре участвовало 70 человек. В момент проведения рекламной игры изменения в правила проведения рекламной игры, состав комиссии по ее проведению не вносились.

В результате проведения розыгрыша призовой фонд в размере 84 400 000 (восемьдесят четыре миллиона четыреста тысяч) белорусских рублей был разыгран в полном объеме.

Победители рекламной игры:

В **1-ом этапе** розыгрыша, который проводился 13 ноября 2008 года, денежный приз в размере 21 100 000 (двадцать один миллион сто тысяч) белорусских рублей, согласно протокола проведения 1 этапа рекламной игры, получил **Любецкий Генрих Станиславович**.

Во **2-ом этапе** розыгрыша, который проводился 27 ноября 2008 года, денежный приз в размере 21 100 000 (двадцать один миллион сто тысяч) белорусских рублей, согласно протокола проведения 2 этапа рекламной игры, получил **Иванов Юрий Валерьевич**.

В **3-ем этапе** розыгрыша, который проводился 11 декабря 2008 года, денежный приз в размере 21 100 000 (двадцать один миллион сто тысяч) белорусских рублей, согласно протокола проведения 3 этапа рекламной игры, получил **Иванов Юрий Валерьевич**.

В **4-ом этапе** розыгрыша, который проводился 25 декабря 2008 года, денежный приз в размере 21 100 000 (двадцать один миллион сто тысяч) белорусских рублей, согласно протокола проведения 4 этапа рекламной игры, получил **Сацюк Владимир Владимирович**.

В период проведения рекламной игры стоимость условной единицы не менялась.

Организатором рекламной игры «Королевские подарки 2» являлось ООО «Дакарай». Правила проведения рекламной игры, состав комиссии по ее проведению, размер и состав призового фонда были зарегистрированы Министерством торговли Республики Беларусь.

Свидетельство о государственной регистрации правил проведения рекламной игры № 1218 от 24 октября 2008 года. УНП 190617507.

КУП «МИНСКИЙ ОБЛАСТНОЙ ЦЕНТР УЧЕТА НЕДВИЖИМОСТИ»

проводит аукцион на право заключения договоров аренды нежилых помещений (сроком на 3 года), расположенных по адресу: Минский район, дер. Б. Тростенец, ул. Западная, 9:

№ лота	Тип нежилого помещения, сооружения	Общая площадь (м²)	Ставка арендной платы за 1 м²	Начальная цена права аренды (бел. руб.)
1	складское помещение	290,1	6 евро	4 761 986
2	складское помещение	209,3	10 евро	5 726 093
3	складское помещение	177,84	10 евро	4 865 401
4	складское помещение	118,3	9 евро	2 912 839
5	складское помещение	93,21	10 евро	2 550 068
6	складское помещение	42,6	9 евро	1 048 918
7	автостоянка	1400	2 евро	7 660 324
8	административное помещение	33,97	6 евро	557 617
9	административное помещение	25,6	6 евро	420 224
10	административное помещение	22,62	6 евро	371 307
11	административное помещение	17,7	6 евро	290 546
12	административное помещение	11,55	6 евро	189 594

Подробное извещение опубликовано в газете «Звязда» от 13.11.2008 г. Аукцион состоится **20.01.2009 г.** в 12.00 по адресу: Минский район, дер. Б. Тростенец, ул. Западная, 9, актовый зал Управления «Торгсервис». Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **19.01.2009 г.** до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова,5, к. 326.

Тел: (8017) 224 61 34. Сайт в интернете: www.rlt.by

УНП 690324015

БПС-БАНК

ОАО «БПС-Банк» 23 декабря 2008 года провело внеочередное Общее собрание акционеров в форме заочного голосования с повесткой дня:

1. Об увеличении уставного фонда ОАО «БПС-Банк» за счет средств республиканского бюджета.
2. О внесении изменений в Устав ОАО «БПС-Банк».
3. О восьмом выпуске простых (обыкновенных) акций ОАО «БПС-Банк».
4. Об оказании ОАО «БПС-Банк» безвозмездной (спонсорской) помощи.
5. О новой редакции Положения о Департаменте внутреннего аудита ОАО «БПС-Банк».

Итоги голосования по проектам решений вопросов повестки дня в вышеуказанной последовательности:

1. «За» — 403 049 904 голоса (99,997 %), «Против» — 2 200 голосов (0,001 %), «Воздержались» — 7 528 голосов (0,002 %);
2. «За» — 403 049 904 голоса (99,997 %), «Против» — 2 200 голосов (0,001 %), «Воздержались» — 7 528 голосов (0,002 %);
3. «За» — 403 049 904 голоса (99,997 %), «Против» — 2 200 голосов (0,001 %), «Воздержались» —

«ФОРМУЛА ВОЛКА» ЖЫВЕ І ПЕРАМАГАЕ

Гэтае прадпрыемства пастаянна ў ліку першых. Тут раней за іншыя роднасныя калектывы добраахвотна пайшлі на стварэнне сістэмы менеджменту якасці і паспяхова атэставалі яе. Першымі ў галіне ўкаранілі і сертыфікавалі сістэму ХАССП, якая забяспечвае высокія спажывецкія якасці і бяспечнасць прадукцыі на аснове аналізу крытычных кропак вытворчасці. Першымі стварылі сетку рознічнага гандлю камбікармамі... Пералік можна працягваць. Не дзіва, што спажыўцы ахвотна едуць сюды па прадукцыю, якой няма ў іншых месцах, а калегі — па вопыт.

З дырэктарам ААТ «Жабінкаўскі камбікормавы завод» Васілём Волкам мы сустрэліся фактычна адразу пасля ўручэння калектыву Дыплома Савета Міністраў Беларусі за дасягненні ў галіне якасці выпускаемай прадукцыі і «аднайменнага» абласнога дыплома.

Пульт кіравання: майстар змены камбікормавага цэха Настасся АРЦЮШЭНКА і в.а. начальніка цэха Міхаіл АНДРАСЮК.

ОАО "Жабинковский Комбикормовый Завод"

Дырэктар Жабінкаўскага камбікормавага завода Васіль ВОЛК.

Дружны калектыў аддзела маркетынгу: Святлана ДАНІЛЬЧАНКА (в.а. начальніка аддзела), Андрэй РАМАНЧУК (нач. сектара), Вольга КУКШЫНАВА, Аксана ГАЛАВЕЙКА, Віктар АЛЕКСЮК, Вольга БАТУЛЯ і Вольга ДАНІЛЮК.

Цэх фасоўкі гатовай прадукцыі. На пярэднім плане — Аляксандр ПАРФЁНАЎ.

Гэта толькі частка ўзнагарод за высокую якасць працы.

На фоне гатовай прадукцыі — брыгадзір Анатоль КАСЯНКОЎ (у цэнтры), Віталь САМАСЮК і Юрый МІХНЮК.

Заатэхнік аддзела маркетынгу Ірына КУЎШЫНАВА.

— Прайшло амаль два гады пасля мінулай публікацыі «Звязды» з вашага прадпрыемства. Што новага, Васіль Канстанцінавіч?

— За гэты час прадпрыемства адзначыла 50-годдзе з дня заснавання. Юбілей стараліся сустрэць з годнасцю. Вытворчая праграма 2007 года далася няпроста, бо ўраджай збожжавых быў слабым. Тым не менш павялічылі аб'ёмы вытворчасці і нават зменшылі імпарт сыравіны, упершыню абышліся без завазнога збожжа — за кошт таго, што кіраўніцтва краіны прыняло абсалютна правільнае рашэнне ўбіраць на зерне «каралеву палёў»-кукурузу. Сёлета мы тым больш не закуплялі зерне за мяжой, хапіла беларускага.

У апошнія гады нам наогул удаецца працаваць у адпаведнасці з праграмай імпартазамяшчэння, з максімальным выкарыстаннем мясцовай сыравіны. Знаходзім нават нечаканыя варыянты. У якасці прыкладу скажу, што выкарыстоўваем адходы крэветачнай вытворчасці суседняга прадпрыемства, а летась сумесна з Коброынскім масласырзаводам асвоілі перапрацоўку падсырнай сыроваткі, якую да гэтага проста зліваліся ў каналізацыю.

— У мінулы наш прыезд вы ў шэрагу іншых відаў прадукцыі ўжо выпускалі корм для сабак «Рэкс» і збіраліся паставіць на паток корм для шчанят «Рэксік»...

— А таксама рыхтавалі яшчэ адну навінку для хатніх любімцаў — корм для катоў. Доўга да ўсяго гэтага ішлі, падбіралі сыравіну і варыянты, каб нашы навінкі сталі запатрабаванымі. Пры іх выпуску ўлічваем міжнародны вопыт. Нават цяпер, калі навінкі на патоку, работа над іх рэцэптурай працягваецца. На выстаўцы ў Гановеры я дамовіўся з польскай фірмай, і ў хуткім часе чакаем у сябе іх спецыялістаў-кансультантаў.

— А як вы праводзілі «апрабацыю», таго ж корму для катоў?

— Раздалі пробныя партыі сваім супрацоўнікам, потым правялі апытанне. Першая доследная партыя была «правалена» нашымі вушастымі «дэгустатарамі», і толькі з другога разу, пасля таго, як удасканалілі рэцэптуру, паказчык паядальнасці перавысіў 84 працэнты. Для пачатку паставілі ва ўласную гандлёвую сетку, далей — больш, пачалі прапаноўваць навінку ў рознічны гандаль, і справа пайшла. Гандлююць нават крамы сталіцы, той жа супермаркет «Прастора» на выездзе з Мінска ў брэсцкім накірунку.

Калі казаць пра фірменны гандаль, то ў нас у шасці раёнах вобласці працуе 20 уласных крамаў, штогод гэтую сетку развіваем. Праз яе рэалізуем больш за 10 працэнтаў сваёй прадукцыі. Плюс з дапамогай рэалізатараў завозім камбікармы ў вёскі: пастаўляем і фермерам, і гаспадарам прысядзібных участкаў. У прыватнасці, даём вяскоўцам таварны крэдыт для вырошчвання свіней на ўласным падворку. Звярніце ўвагу на статыстыку: прыкладна 75 працэнтаў камбікармоў вяскоўцы купляюць для адкорму свіней, прыкладна 9-12 працэнтаў — для свойскай птушкі.

Ва ўсіх абласных цэнтрах набралі групы рэалізатараў корму для сабак, якія адначасова займаюцца продажам корму для трусоў, птушак, коз і г.д.

— Васіль Канстанцінавіч, медыкі, калі лечаць чалавека, раяць яму піць мінеральную ваду з мясцовых крыніц, адпачываць у мясцовых санаторыях, травамі лячыцца не завазнымі...

— Харчавацца яны таксама раяць у асноўным прадуктамі, якімі спрадвеку харчаваліся нашы бацькі і дзяды. Тлумачаць гэта тым, што ў вадзе, у травах, у прадуктах набор солей і мікраэлементаў ідэнтычны набору ў арганізме жыхара той ці іншай мясцовасці. Адбываецца іх поўнае сумяшчэнне. Так і нашы камбікармы складаюцца з мікраэлементаў, да якіх прывык, прыстасаваўся арганізм жывёлы ў пятым, дзясятым пакаленні. І пры яго спажыванні засваяльнасць і карысць максімальныя.

Тым больш што прадукцыя наша — натуральная, не прымяняем ніякіх «ешак» ні «цэшак». Адзінае, дадаём у корм для сабак у нязначнай колькасці антыаксідант, каб не акісляўся тлушч. І некаторыя імпартныя складнікі прымяняюцца ў «тонкай рэцэптуры» — для «малых»: цялят, парасят, куранят.

Выконваючы задачу максімальнага выкарыстання мясцовай сыравіны, закупілі і ўстанавілі лінію па перапрацоўцы насення рапсу. Гэта чыста бялковая сыравіна, у вытворчасць ідуць яе алей і жом — свежыя, натуральныя, без кансервантаў. А нязначнае ўдасканаленне ўжо існуючых ліній дазволіць перапрацоўваць таксама насенне сланечніка і соі.

Працуем з беларускімі пшаніцай, ячменем, трыцікале. Працуем на мясцовай мясакоснай муцэ, у тым ліку курынай, якасць якой высокая, і пратэін высокі. Дадаём меласу (патаку), вельмі неабходную малочнаму статку, уводзім макуху. Перапрацоўваем лубін, проса і пайзу, на «тонкіх рэцэптах» выкарыстоўваем сухое малако... Здробленае зерне аздабляем бялкова-вітаміннымі мінеральнымі дабаўкамі.

— Вы ўзгадалі пра новыя лініі. Як наогул расце ваша тэхнічная ўзброенасць?

— Гатовая да пуску лінія папярэдняга змешвання тарыраванай сыравіны (якая паступае ў мяшках), у студзені прыедуць спецыялісты, каб яе запусціць. Ураджай новага года сустрэнем з яшчэ адной сушылкай зерня, мантаж фактычна завершаны. Рапс і кукурузу новага ўраджаю будзем сушыць на гэтай лініі.

Закупілі галандскую лінію па мікрадазіраванні, якая можа адначасова падбіраць да 12 кампанентаў кармоў. Прычым забяспечвае не толькі мікрадазіраванне да адной сотай працэнта, але і гамагеннасць — абсалютна раўнамернае змешванне. Устанавілі дадаткова нямецкі гранулятар, стала лягчэй працаваць з дробнай гранулай, і ў сезон вытворчасці камбікармоў для рыбаў павялічым выпуск прадукцыі. Зараз да 80 працэнтаў усіх камбікармоў перадаём спажыўцам у найбольш зручнай для іх форме — у гранулах. І ўся прадукцыя праходзіць тэрмічную апрацоўку, што таксама вельмі важна.

Якраз сёння галоўны інжынер паехаў у Нацыянальную акадэмію навук Беларусі абараняць праект будаўніцтва сучаснага, цудоўна аснашчанага тэхнічна элеватара, даказваць, што нам ён крайне неабходны. Будзем прасіць, каб завод падтрымалі інвестыцыямі.

А на днях павінна прыйсці драбілка кампанентаў корму для свойскай жывёлы.

— Значыць, яшчэ больш палепшыцца яго якасць...

— Арыенцір на высокую якасць — гэта стратэгія, тактыка, палітыка нашага калектыву. Калі ў сярэдзіне 90-х гадоў здарыўся чарговы фінансавы крызіс, то каб выжыць, калектыў узяў курс на якасць. Вывучалі сусветны вопыт, новыя тэхналогіі, наогул новыя падыходы да кормавытворчасці. І ў выніку... пайшлі на распрацоўку сістэмы менеджменту якасці на аснове міжнароднага стандарта ISO 9000. Не хапала сродкаў, таму распрацоўвалі сістэму самі. Селі за парты і дасканала разабраліся ва ўсіх яе тонкасцях. Нашымі шчырымі дарадцамі і кансультантамі сталі супрацоўнікі Брэсцкага зальнага Цэнтра па стандартызацыі, метралогіі і сертыфікацыі, якім кіруе Ніна Іванаўна Бусень. Сістэма стала сур'ёзным падспор'ем, бо сістэматызаваны тэхналагічны працэс і задзейнічаны тыя стандарты, якія неабходныя ў рабоце.

Услед за гэтым паклапаціліся і пра поўную бяспечнасць сваёй прадукцыі — укаранілі сістэму ХАССП (іншыя камбікормавыя прадпрыемствы краіны да гэтага часу да яе толькі прыглядваюцца, не ў крыўду ім будзе сказана). А зараз дабіваемся поўнага і гарманічнага ўзаемадзеяння ўсіх сваіх сістэм — і на базе ISO, і ХАССП, і па экалагічнай бяспецы (ахове навакольнага асяроддзя), а таксама на бяспецы працы. Але на вяршыні ўсяго гэтага кангламерата — сістэма кіравання якасцю.

— Належная тэхнічная аснашчанасць, упэўненасць у высокай якасці сваёй прадукцыі дазваляюць і працаваць упэўнена?

— Больш за тое — адрасна. Бо з кожным спажыўцом мы ўзгадняем не толькі вагу адпушчанага камбікорму, але і дакладную рэцэптуру, цану. Дарэчы, цана на нашу прадукцыю значна ніжэйшая, чым на аналагічную імпартную.

Узгадняем таварны выгляд: пастаўляць россыпам ці ў гранулах. Інакш кажучы, рыхтуем камбікармы пад заказ. На студзень ужо сфарміравана падрабязная заяўка на вытворчасць камбікармоў. Мы ведаем, колькі тон ці кілаграмаў якой канкрэтна гаспадарцы і ў які дзень патрэбна аддаць. Такое ўзгадненне дадае работы заводу, патрэбна ўсё пралічыць да грама і загадзя падрыхтаваць, але спрыяе ўзаемаразуменню са спажыўцом.

Менавіта так будуем свае ўзаемаадносіны з птушкафабрыкай «Дружба», з Камароўскай птушкафабрыкай (гэта на радзіме першага касманаўта Беларусі Пятра Клімука), з шэрагам буйных комплексаў — «Белавежскім», «Заходнім», «Узыходзячай зарой» і іншымі. З большасцю спажыўцоў усталяваліся не проста партнёрскія, а нават даверальныя адносіны. Скажам, некалі калгас «Узыходзячая зара» Кобрынскага раёна купляў камбікармы адразу на некалькіх заводах. У 1995 годзе мы прапанавалі яго старшыні Івану Іванавічу Тарасюку: давайце падпішам дагавор на садружнасць, і мы гарантуем на вашым комплексе 500 грамаў прываг на адкорме. Па факту атрымалася 550. На той час гэта быў цудоўны вынік. Не дзіва, што партнёрства наша мацнее з году ў год. І прывагі даўно перавысілі 600 грамаў у суткі.

У нас заказваюць камбікармы адзінаццаць гаспадарак Жабінкаўскага раёна, 14 — Брэсцкага, дзясятак — Камянецкага, а ўсяго абслугоўваем шэсць раёнаў Брэсцкай вобласці і плюс аддаём кармы ў гандаль. Напружанне ў калектыве даволі высокае, калі ўлічваць усе тонкасці і нюансы нашай працы.

— Тым не менш вы думаеце пра перспектыву...

— Прынята рашэнне будаваць пры нашым камбікормавым заводзе буйны жывёлагадоўчы комплекс па адкорме свіней, на 24 тысячы галоў, аб'ект уключаны ў абласную праграму. Выдзелена 100 гектараў зямлі, сёння стаіць пытанне аб праектным рашэнні.

Вопыт працы з такімі буйнымі комплексамі ў нас ёсць. Усе тыя комплексы, якія «карміліся» пры Жабінкаўскім заводзе, не ходзяць у стратных. У свой час менавіта ў цесным супрацоўніцтве з комплексамі мы не далі адзін другому загінуць. Пабудуем уласны, аснасцім яго па апошнім слове тэхнікі і па сучасных тэхналогіях і зможам дабіцца больш важкіх вынікаў у працы. На яго патрэбы будзем накіроўваць прыкладна 15 працэнтаў сваёй прадукцыі, атрымаем іх за кошт нарошчвання выпуску камбікармоў (сёлета прыраслі на 20 працэнтаў). Так што астатнія спажыўцы не будуць пакрыўджаны.

Маючы на ўвазе такую перспектыву, мы не супраць будаўніцтва на заводзе яшчэ адной лініі па вытворчасці камбікармоў, якая па сваіх параметрах стане сапраўдным заводам на заводзе. Такія планы я выношваю даўно, але «агучваю» ўпершыню. Гэтая буйная лінія як аўтаномны цэх будзе выпрацоўваць «тонкі рэцэпт» — высакаякасныя камбікармы і бялкова-вітамінныя дабаўкі для цялятак, парсючкоў і іншай «дзетвары». Праўда, зноў жа спатрэбіцца дапамога інвестараў, будзем думаць, як іх прыцягнуць.

— Бачым, што па-ранейшаму дзейнічае ваша знакамітая «Формула Волка»: хочаш жыць — будуй, хочаш развівацца — будуй, хочаш быць «на ўзроўні» — будуй.

— Маецца на ўвазе не толькі і не столькі працэс узвядзення новых памяшканняў і будынкаў, хоць і гэта таксама. А яшчэ і новыя лініі, новыя тэхналогіі, і сацыяльная палітыка ў калектыве. Тое, што ўкладваецца ў сэнс рускага слова «созидай». Стварай, твары.

Гэтая формула — маральны стрыжань нашага калектыўнага жыцця. Жыццё ўвесь час нагадвае нам пра гэты свой закон. Пастаянна патрэбна вырашаць пытанні, якія набягаюць кожны дзень. Не адкладваць іх на потым і не хаваць галаву ў пясок. Сёння спазніўся — заўтра не дагоніш.

